ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 7 (2276)
24 студзеня 1969 г. ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ВЯЛІКІМ ЗАПАВЕТАМ ВЕРНЫЯ

Тры дні ў Мінску праходзіла нарада бібліятэчных і камсамольскіх работнікаў краіны, якая падвяла вынікі Усесаюзнай маладзёжнай чытацкай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю ВЛКСМ. З дакладамі выступілі член бюро ЦК ВЛКСМ, дырэктар выдавецтва «Молодая гвардия» В. Ганічаў і начальнік Галоўнай бібліятэчнай інспекцыі Міністэрства культуры СССР В. Сяроў.

Удзельнікі Усесаюзнай нарады абмяняліся вопытам работы сярод маладых чытачоў, пазнаёміліся з кніжна-ілюстрацыйнай выстаўкай «Запаветам Леніна верныя», з работай лепшых бібліятэк Мінска, пабывалі ў масавых гарадскіх бібліятэках, атрымалі карысныя метадычныя кансультацыі.

Цікавымі былі сустрэчы ўдзельнікаў нарады з пісьменнікамі М. Агашынай, М. Аўрамчыкам, Р. Барадуліным, А. Вольскім, А. Дзяменцьевым, Е. Лось, В. Лукшам, А. Трубнікавай, І. Шамякіным, народнай артысткай рэспублікі З. Браварскай, лаўрэатамі прэміі Ленінскага камсамола Беларусі кінарэжысёрам Л. Голубам і драматургам К. Губарэвічам, Героем Савецкага Саюза М. Осіпавай.

Госці беларускай сталіцы зрабілі экскурсію па Мінску, пабывалі ў музеях.

Вялікая група бібліятэчных і камсамольскіх работнікаў была ўзнагароджана Граматамі ЦК ВЛКСМ, значком Міністэрства культуры СССР «За выдатную работу» і каштоўнымі падарункамі. Сярод узнагароджаных — мінская гарадская бібліятэка «Юнацтва» і Маладзечанская цэнтральная бібліятэка.

Удзельнікі нарады прынялі рашэнне правесці Усесаюзную маладзёжную чытацкую канферэнцыю «Запаветам Леніна верныя», прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння правадыра.

ДА ЮБІЛЕЮ СТАНІСЛАВА МАНЮШКІ

У маі гэтага года спаўняецца 150 гадоў з дня нараджэння выдатнага кампазітара, заснавальніка польскай нацыянальнай класічнай оперы Станіслава Манюшкі. Гэты юбілей рыхтуецца шырока адзначыць музычная грамадскасць Польскай Народнай Рэспублікі і БССР. У нас урачыстасці будуць праходзіць у Мінску і на радзіме кампазітара — у вёсцы Убель Чэрвеньскага раёна.

У сувязі з гэтымі мерапрыемствамі ў сталіцы нашай рэспублікі пабывалі польскія музыказнаўцы К. Мазур, М. Дамброўскі, К. Чайкоўскі, Т. Кевберска. Яны наведалі мясціны, дзе нарадзіўся кампазітар, пабывалі ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, у тэатры оперы і балета, у рэпертуары якога ёсць і творы С. Манюшкі.

У Беларускім таварыстве культурных сувязей з зарубежнымі краінамі госці ўдакладнілі і ўзгаднілі план мерапрыемстваў, якія будуць праведзены да юбілею вялікага кампазітара, дырыжора і педагога С. Манюшкі на беларускай і польскай зямлі.

ГОД 1969. ЛЕНІНСКАЯ ВАХТА

Дзень за днём набліжаюць нас да ўрачыстай даты — 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. 22 красавіка 1970 года ўвесь савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначаць сотую гадавіну з дня нараджэння чалавека, імя якога—сімвал новай гістарычнай эпохі, вучэнне якога — вечна жывая крыніца рэвалюцыйнай думкі і рэвалюцыйнага дзеяння.

Набліжэнне гэтай велічнай даты выклікала новы прыліў актыўнасці ва ўсіх галінах працоўнага, грамадскага, творчага жыцця краіны. У нас у рэспубліцы калектывы Мінскага ордэна Леніна трактарнага завода, Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга аўтамабільнага завода, Віцебскага дывановага камбіната, Гомельскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання і Мінскага завода аўтаматычных ліній вырашылі аб'явіць 1969 год годам ленінскай ударнай работы, годам высокай прадукцыйнасці працы і выдатнай якасці прадукцыі і звярнуліся да ўсіх вытворчых калектываў з заклікам падтрымаць іх пачын, праславіць Радзіму новымі працоўнымі здзяйсненнямі. Каштоўны пачын перадавых прадпрыемстваў знаходзіць шырокую падтрымку сярод працаўнікоў сельскай гаспадаркі. У прыватнасці, яго горача падтрымалі калгасы і саўгасы Карэліцкага раёна.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі ў сваёй пастанове ад 17 студзеня 1969 года адобрыў ініцыятыву калектываў перадавых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў рэспублікі зрабіць 1969 год годам ленінскай ударнай работы. Ударная ленінская вахта, пачатая перадавымі калектывамі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў рэспублікі, адзначаецца ў пастанове, з'яўляецца важным фактарам павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці і ўздыму дабрабыту народа. Яна адкрывае новую слаўную старонку ва ўсенародным сацыялістычным спаборніцтве за датэрміновае выкананне заданняў пяцігодкі і дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

ЦК КП Беларусі выказаў спадзяванне, што дастойны ўклад да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна ўнясуць дзеячы навукі і літаратуры, наша працоўная інтэлігенцыя, усе работнікі разумовай працы, што яны будуць і ў далейшым аддаваць свае сілы і веды вялікай справе камуністычнага будаўніцтва, з высокім натхненнем і настойлівасцю развіваць навуку і тэхніку, ствараць новыя яркія творы літаратуры і мастацтва, несці сацыялістычную культуру ў масы, дапамагаць выхоўваць падрастаючае пакаленне ў духу камунізма.

«Лепшы спосаб адсвяткаваць гадавіну вялікай рэвалюцыі —гэта засяродзіць увагу на нявырашаных задачах яе»,— пісаў Уладзімір Ільіч напярэдадні чацвёртай гадавіны Кастрычніка. Ці трэба казаць, што гэтымі мудрымі словамі нам трэба кіравацца і сёння, кіравацца і ў нашай падрыхтоўцы да ўрачыстай ленінскай даты. Ленінская вахта творчых арганізацый і культурна-асветных устаноў—гэта самае шырокае праяўленне ініцыятывы, пошукі новых цікавых форм работы, замацаванне і працяг поспехаў і пачынанняў, народжаных у ходзе падрыхтоўкі да нядаўна адзначанага 50-годдзя нашай рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі.

Усё наша сённяшняе жыццё, уся наша гераічная гісторыя—гэта ўвасабленне ленінскіх ідэй, ленінскіх запаветаў. Ленін з намі ў нашых радасцях і клопатах. З намі супраць усяго, што перашкаджае будаваць камунізм. З намі ў палітыцы і эканоміцы, у этыцы, пачуццях, узаемаадносінах. Зусім натуральна, што ленінскія вечары, чытанні, канферэнцыі, сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі, якія адбываюцца цяпер у клубах, бібліятэках, дамах культуры, часта ператвараюцца ў шчырыя размовы аб сённяшнім нашым дні, аб надзённых праблемах і задачах.

На тое, каб кожная сустрэча з Леніным вучыла, выхоўвала, узбагачала, дапамагала, і трэба арыентавацца культурна-асветным установам. «Няма нічога больш узвышанага і высакароднага, чым браць прыклад з Леніна, самааддана змагацца за справу, якой ён прысвяціў сваё жыццё», —гаворыцца ў пастанове ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна». Таму адна справа—калі ўдзельнікі канферэнцыі па твору, прысвечанаму Ільічу, абмяжуюцца тым, што проста нагадаюць эпізоды з прачытанай кнігі; і зусім іншае—калі ўзнікне гаворка, дыспут аб тым, што ж вынікае з прачытаных эпізодаў, які вывад я павінен зрабіць для сябе, для сваіх грамадскіх паводзін, адносін, імкненняў...

Пад знакам ленінскага юбілею разгортваюць сваю дзейнасць і нашы прафесіянальныя мастацкія калектывы і арганізацыі. Творчыя планы тэатраў і канцэртных устаноў, асабістыя задумы пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, артыстаў будуюцца зараз з такім разлікам, каб на працягу кароткага часу, што застаўся да ўрачыстай юбілейнай даты, яшчэ і яшчэ раз пагаварыць з чытачом, гледачом, слухачом пра самае важнае і дарагое для ўсіх нас, пра тое, каб мераць сябе і сваё жыццё з ягонай, ленінскай вышыні.

У гэтай сувязі вельмі зразумелае імкненне многіх тэатраў, пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў непасрэдна ўвасобіць вобраз Уладзіміра Ільіча. Няма для аўтара задачы вышэй і прывабней, чым па-мастацку асэнсаваць і перадаць на сцэне, палатне, у кнізе, музычным творы жывыя рысы ленінскага характару, раскрыць малавядомую або па-новаму ўбачыць вядомую старонку ленінскай біяграфіі, адказаць на хвалюючыя нас сёння пытанні вострай і актуальнай ленінскай думкі. Лепшыя творы савецкай Ленініяны апошніх гадоў пераканаўча сведчаць, якой невычэрпнай крыніцай мастакоўскага натхнення з'яўляецца гэта высакародная тэма і які гэта найсучаснейшы з сучаснікаў— Ленін.

Але наколькі прывабная і высакародная гэта задача, настолькі яна і адказная. Толькі тады мастак мае маральнае права на спробу яе вырашэння, калі глыбока пераканаены, што творам сваім скажа ў літаратурнай, мастацкай, тэатральнай, музычнай Ленініяне сапраўды новае слова. Не будзем забываць ленінскае ж выслоўе—лепш менш, ды лепш! Беларуская мастацкая Ленініяна дастаткова багатая на здабыткі, якія пераканаўча сведчаць, што гэтае «лепш» —нам пад сілу.

Між тым, некаторыя тэатры, выдавецтвы, літаратурныя выданні рэспублікі не праяўляюць належных патрабаванняў да твораў з вобразам Уладзіміра Ільіча, свядома ці несвядома заахвочваюць аўтараў, якія спадзяюцца, што тэма «сама вывезе». А ў выніку—гэтая высокая, сапраўды святая для савецкага мастацтва тэма разменьваецца, прыніжаецца, дыскрэдытуецца!..

Час—
пачынаю
пра Леніна расказ,—

сказаў больш за чатыры дзесяцігоддзі таму назад Уладзімір Маякоўскі.

Гэты ўсхваляваны расказ працягваецца.
Нашы натхнёныя будні—гэта расказ пра Леніна.
Нашы касмічныя перамогі—гэта расказ пра Леніна.
Нашы творчыя здзяйсненні—гэта расказ пра Леніна.

Вечна будзе ленінскае сэрца
Клакатаць у рэвалюцыі ў грудзях.

МАСКВА ЎШАНОЎВАЕ ЗОРНЫХ БРАТОЎ

Новую вялікую радасць перажывае наша Радзіма. Як родная маці яна прыняла ў ласкавыя абдымкі зорных братоў-герояў.

Асабліва вялікія ўрачыстасці ў гэтыя дні адбыліся ў сэрцы Савецкай Радзімы — Маскве. Не ўпершыню ёй сустракаць герояў космасу. З таго часу, як Юрый Гагарын адкрыў новую эру ў асваенні космасу, масквічы сем разоў радасна і горача сустракалі космапраходцаў.

І вось 22 студзеня Масква восьмы раз выказала ўсенародную любоў новым пакарыцелям Сусвету — Уладзіміру Шаталаву, Барысу Валынаву, Аляксею Елісееву і Яўгену Хрунову.

...Дзяржаўнымі флагамі, лозунгамі і транспарантамі ўпрыгожаны Унукаўскі аэрапорт. На фасадзе галоўнага будынка партрэт Уладзіміра Ільіча Леніна, пад чыім сцягам наша краіна ўпэўнена ідзе ад перамогі да перамогі. З думамі аб Леніне здзяйснялі свае гераічныя справы ўсе савецкія касманаўты. Палёт «Саюза-4» і «Саюза-5» — новы важны ўклад айчыннай навукі і тэхнікі ў дасягненні, якімі наш народ адзначае надыходзячае 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна.



Масква. Крамлёўскі палац з'ездаў. У прэзідыуме ўрачыстага мітынгу.

У гэты па-святочнаму радасны дзень ва Унукава сабраліся члены ЦК КПСС, дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР і РСФСР, іншыя партыйныя і дзяржаўныя дзеячы, маршалы Савецкага Саюза і родаў войск, вучоныя і інжынеры, генералы і афіцэры Савецкай Арміі, прадстаўнікі прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, устаноў, стваральнікі новай касмічнай тэхнікі — ракет, міжпланетных аўтаматычных станцый, спадарожнікаў, касмічных караблёў.

На сустрэчу пакарыцеляў і герояў космасу на аэрадром прыбылі таварышы Л. І. Брэжнеў, Г. І. Воранаў, А. Я. Пельшэ, М. В. Падгорны, Д. С. Палянскі, М. А. Суслаў, А. М. Шалепін, Ю. У. Андропаў, В. В. Грышын, П. Н. Дземічаў, П. М. Машэраў, В. П. Мжаванадзе, Д. Ф. Усцінаў, І. В. Капітонаў, К. Ф. Катушаў, Б. М. Панамароў.

У 13 гадзін у студзеным зімовым небе з'яўляецца паветраны лайнер «ІЛ-18» у суправаджэнні ганаровага эскорта знішчальнікаў. І вось родная зямля Падмаскоўя. Адчыняюцца дзверы карабля, і на парадны трап уступаюць зорныя браты Уладзімір Шаталаў, Барыс Валынаў, Яўген Хруноў, Аляксей Елісееў. Грыміць паветраны марш «Всё выше»... Чоткім крокам касманаўты накіроўваюцца да ўрадавай трыбуны. Камандзіры касмічных караблёў Уладзімір Шаталаў і Барыс Валынаў дакладваюць Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР, Савету Міністраў СССР аб паспяховым завяршэнні палёту і выкананні ганаровага задання партыі і ўрада.

Гучыць Дзяржаўны гімн Савецкага Саюза. Марознае студзеньскае паветра разрываюць залпы артылерыйскага салюта.

Кіраўнікі партыі і ўрада моцна абдымаюць і цалуюць касманаўтаў. Сардэчныя абдымкі родных і таварышаў па атраду. Дзеці ўручаюць героям, кіраўнікам партыі і ўрада букеты жывых кветак.

Праз суцэльны людскі калідор трыумфальны картэж накіроўваецца ў Маскву, у Крамлёўскі Палац з'ездаў. Тут адбыўся самы ўрачысты момант сустрэчы з героямі касмічнай эпапеі — мітынг працоўных сталіцы.

Мітынг прадстаўнікоў працоўных сталіцы, прысвечаны выдатнай перамозе савецкага народа ў асваенні космасу і сустрэчы з лётчыкамі-касманаўтамі У. Шаталавым, Б. Валынавым, А. Елісеевым, Я. Хруновым, адкрыў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар Маскоўскага гарадскога камітэта партыі В. В. Грышын.

— Масквічы, як і ўсе савецкія людзі, — гаворыць ён, — моцна абдымаюць і горача віншуюць з паспяховым выкананнем задання Радзімы сваіх новых герояў космасу — палкоўніка Шаталава Уладзіміра Аляксандравіча, палкоўніка Валынава Барыса Валянцінавіча, палкоўніка Хрунова Яўгена Васільевіча, бортінжынера Елісеева Аляксея Станіслававіча.

— Мы сардэчна віншуем таксама, — гаворыць В. В. Грышын, — вучоных, канструктараў і рабочых, якія стварылі касмічныя караблі «Саюз-4» і «Саюз-5» усіх тых, хто арганізоўваў і кіраваў іх палётам.

Гучыць мелодыя Гімна Савецкага Саюза. Слова для выступлення атрымлівае камандзір касмічнага карабля «Саюз-4», лётчык-касманаўт, палкоўнік Уладзімір Шаталаў.

— Шчаслівы далажыць Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР, Савецкаму ўраду, усяму савецкаму народу, што палёт касмічных караблёў «Саюз-4» і «Саюз-5» паспяхова завершаны.

Ад імя сваіх таварышаў-касманаўтаў У. Шаталаў перадае сыноўнюю падзяку партыі, ураду, народу за аказанае высокае давер'е — удзельнічаць у выкананні гэтага адказнага задання.

— Палёт караблёў «Саюз-4» і «Саюз-5», — гаворыць У. Шаталаў, — адкрывае якасна новы этап у далейшым вывучэнні космасу. Упершыню ў свеце ў выніку ручной стыкоўкі пілатуемых касмічных караблёў на арбіце штучнага спадарожніка Зямлі была сабрана і паспяхова функцыянікравала эксперыментальная касмічная станцыя і ў час арбітальнага палёту гэтай станцыі быў ажыццёўлен пераход двух касманаўтаў з аднаго карабля ў другі.

Значэнне гэтых навуковых эксперыментаў цяжка пераацаніць для далейшага асваення касмічнай прасторы.

— Усе поспехі нашай партыі, нашага народа ў будаўніцтве сацыялізма і камунізма, — сказаў у сваім выступленні У. Шаталаў, — звязаны з імем вялікага Леніна. Уладзімір Ільіч быў глыбока ўпэўнены, што ва ўмовах сацыялістычнага грамадства навука зробіць новыя, яшчэ небывалыя адкрыцці і паставіць іх на службу працоўнаму чалавеку. Мы шчаслівыя, што з'яўляемся ўдзельнікамі і сведкамі ажыццяўлення ленінскіх прадвызначэнняў.

Бурнымі апладысментамі сустрэла зала з'яўленне на трыбуне і выступленні зорных братоў У. Шаталава — Б. Валынава, Я. Хрунова і А. Елісеева.

Затым слова атрымлівае Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі таварыш Л. І. Брэжнеў. Ён сказаў:

— З пачуццём гордасці савецкі народ славіць сваіх мужных сыноў, якія толькі што вярнуліся з выдатнага касмічнага рэйса, — камуністаў, патрыётаў, лётчыкаў-касманаўтаў Уладзіміра Аляксандравіча Шаталава, Барыса Валянцінавіча Валынава, Аляксея Станіслававіча Елісеева і Яўгена Васільевіча Хрунова.

Л. І. Брэжнеў гаворыць аб вялікім значэнні таго, што зроблена ў гэтыя дні таварышамі Шаталавым, Валынавым, Елісеевым і Хруновым для далейшага асваення космасу. Пакладзены паспяховы пачатак стварэнню вялікіх навуковых арбітальных станцый. Групавы выхад у космас і пераход касманаўтаў з аднаго карабля ў другі ствараюць перадумовы для абслугоўвання такіх касмічных станцый, для змены іх экіпажа. Створаны таксама магчымасці для вырашэння задачы выратавання касманаўтаў у выпадку ўзнікнення якіх-небудзь аварый пры палётах на арбіце вакол Зямлі, або пры далёкіх рэйсах у міжпланетнай прасторы.

Л. І. Брэжнеў падкрэслівае практычнае значэнне палётаў нашых касмічных караблёў. Ужо сёння вынікамі касмічных даследаванняў карыстаюцца, па сутнасці, усе народы зямнога шара. Дастаткова назваць такія галіны навукі і тэхнікі, як касмабачанне, звышдалёкая тэлефонная і тэлеграфная сувязь, удзел касмічных апаратаў у складанні прагнозаў надвор'я, касмічная навігацыя марскіх караблёў.

— І яркімі поспехамі ў асваенні касмічнай прасторы, і выдатнымі працоўнымі перамогамі на зямлі, — гаворыць у заключэнне Л. І. Брэжнеў, — сустракае савецкі народ набліжэнне вялікай гадавіны — стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Можна з упэўненасцю сказаць, што слаўныя справы савецкіх людзей будуць яшчэ больш памножаны на працягу будучага года і азнамянуюць сабой новы важны этап будаўніцтва камуністычнага грамадства ў нашай краіне. Перамогі ў мірнай стваральнай працы, дасягненні ў развіцці навукі, поспехі ў барацьбе нашай партыі і Савецкай дзяржавы на міжнароднай арэне за справу трывалага міру і сацыялізма — вось лепшы спосаб адзначыць юбілей вялікага Леніна.

Прамова таварыша Л. І. Брэжнева была выслухана з вялікай увагай і не раз перапынялася бурнымі, працяглымі апладысментамі.

Потым выступіў член Палітбюро ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. В. Падгорны. Ён паведаміў аб Указах Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза Шаталаву Уладзіміру Аляксандравічу, Валынаву Барысу Валянцінавічу, Елісееву Аляксею Станіслававічу, Хрунову Яўгену Васільевічу і аб прысваенні ім звання «Лётчык-касманаўт СССР».

М. В. Падгорны пад бурныя апладысменты ўсіх удзельнікаў мітынгу ўручыў героям узнагароды і пажадаў зорным братам новых поспехаў і подзвігаў на славу Радзімы.

■

22 студзеня ў Крамлі быў наладжан прыём ад імя Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і ўрада СССР у гонар новага выдатнага подзвігу вучоных, канструктараў, інжынераў, тэхнікаў і рабочых і ў гонар касманаўтаў У. А. Шаталава, Б. В. Валынава, А. С. Елісеева, Я. В. Хрунова, якія забяспечылі і паспяхова ажыццявілі стыкоўку касмічных караблёў «Саюз-4» і «Саюз-5», першы ў свеце пераход касманаўтаў з аднаго карабля ў другі ў час арбітальнага палёту.

Бурнымі апладысментамі сустрэлі прысутныя кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, членаў экіпажаў «Саюза-4» і «Саюза-5», іншых герояў космасу.

Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў горача і сардэчна павіншаваў герояў-касманаўтаў, пажадаў ім добрага здароўя, шчасця, поспехаў у вялікай складанай рабоце. Ён прапанаваў тост за здароўе доблесных сыноў Айчыны У. А. Шаталава, Б. В. Валынава, А. С. Елісеева і Я. В. Хрунова, імёны якіх у гэтыя дні паўтараюць людзі ўсёй зямлі.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. В. Падгорны абвясціў тост за нашых канструктараў, інжынераў, тэхнікаў, рабочых, за тых, хто стварыў цудоўныя караблі і забяспечыў новы паспяховы палёт у касмічную прастору.

Крамлёўскі прыём з'явіўся хвалюючым завяршэннем урачыстага дня сустрэчы касманаўтаў у Маскве.

СУСТРЭЧА Ў ЦЭХУ

Чырвоны куток цэха лесавозаў Мінскага аўтазавода запоўнілі рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі. Да іх у госці прыйшлі артысты Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета. Дырэктар тэатра Ф. Жыгалаў пазнаёміў слухачоў з удзельнікамі канцэрта, расказаў аб планах шэфскай работы творчага калектыву тэатра на Мінскім аўтазаводзе.


Канцэрт пачаў саліст М. Пушкароў. Ён выканаў беларускія і ўкраінскія песні.

Цёпла сустрэлі рабочыя выступленні народнай артысткі СССР Т. Ніжнікавай, народных артыстаў рэспублікі Т. Шымко, В. Міронава, маладых салістаў балета Л. Бржазоўскай і Ю. Траяна. Канцэртмайстрам гэтага канцэрта ў цэху была заслужаная артыстка рэспублікі М. Ражнова.

Рабочыя адзінадушна залічылі народную артыстку СССР Т. Ніжнікаву ганаровым членам калектыву ўчастка, якому прысвоена высокае званне «Калектыву імя 50-годдзя БССР», Спявачка шчыра падзякавала аўтазаводцам за высокі гонар і паабяцала, што будзе часцей сустракацца з калектывам ардэнаноснага завода.

Пакладзены пачатак вялікай дружбе двух калектываў—сацыялістычнай садружнасці Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета і Мінскага аўтазавода. Наперадзе новыя сустрэчы, новыя канцэрты.

З ЮБІЛЕЙНАЙ МАСТАЦКАЙ



Ю. і В. ГАПАК. НАРОДНАЯ ПЕСНЯ. (Дэкаратыўная дошка).

29 ТАМОЎ НАРОДНЫХ СКАРБАЎ

Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР рыхтуе да выдання шматтомны Збор твораў беларускага фальклору. Наш карэспандэнт звярнуўся да дырэктара інстытута акадэміка АН БССР П. Глебкі з просьбай расказаць, што сабой уяўляе і як будзе ажыццяўляцца гэтае выданне.

— Шматтомны Збор твораў беларускага фальклору, — адзначыў П. Глебка, — выдаецца ў нас упершыню. Мяркуецца, што ён будзе складацца з 29 тамоў. Памеры аднаго тома — 30—40 умоўных друкаваных аркушаў. Такім чынам, па аб'ёме гэтае выданне намнога пераўзыйдзе ўсе фальклорныя зборнікі, выпушчаныя ў дакастрычніцкі і савецкі час. Гэта будзе самы грунтоўны і самы прадстаўнічы звод беларускага фальклору, які ахопіць усё лепшае, што створана беларускім народам на працягу яго гісторыі ва ўсіх вусна-паэтычных жанрах.

Шматтомны Збор беларускага фальклору падсумуе, дарэчы, і ўсе набыткі беларускай фалькларыстыкі.

У выданні будзе шырока прадстаўлена спадчына дарэвалюцыйных фалькларыстаў — працы, публікацыі і запісы Я. Чачота, П. Шпілеўскага, І. Насовіча, П. Бяссонава, П. Шэйна, Е. Раманава, М. Федароўскага, А. Сержпутоўскага і многіх іншых збіральнікаў і даследчыкаў беларускага фальклору.

Увойдуць у збор і многія фальклорныя матэрыялы, што выяўлены ў беларускіх архівах, а таксама ў архіўных сховішчах Масквы, Ленінграда, Вільнюса.

Вялікая колькасць фальклорных тэкстаў выбрана з выданняў і публікацый савецкага часу — з перыядычнага друку, са збораў Р. Шырмы, Г. Цітовіча, М. Чуркіна, Ф. Янкоўскага.

Нарэшце, будуць апублікаваны шматлікія матэрыялы, сабраныя нашым інстытутам у выніку фальклорных экспедыцый, і запісы, атрыманыя намі з вышэйшых навучальных устаноў, з дамоў народнай творчасці і ад асобных збіральнікаў.

Галоўным крытэрыем пры адборы тэкстаў для выдання была перш за ўсё ідэйна-мастацкая вартасць твораў, іх арыгінальнасць. Апрача таго, укладальнікі ўлічвалі і месца бытавання твораў — тэксты падбіраліся так, каб у выданні былі прадстаўлены ўзоры кожнага фальклорнага жанру ўсіх абласцей Беларусі.

Цяпер пра структуру ўсяго выдання і асобных тамоў. Фальклорны матэрыял, які ўвойдзе ў збор, сістэматызаваны ў адпаведнасці з прынцыпамі класіфікацыі, прынятымі ў сучаснай фалькларыстыцы. Фальклорныя творы групуюцца па сваіх жанравых і функцыянальных якасцях з улікам і сюжэтна-гісторыка-тэматычных асаблівасцей.

Усе фальклорныя творы падзелены ў зборы на тры асноўныя «родавыя» групы: песенная творчасць, народная проза і народная драма. Унутры гэтых груп ажыццяўляецца жанравы падзел.

Больш за палову тамоў усяго выдання будзе аддадзена песням. Такім песенным жанрам, як працоўныя, каляндарныя, абрадавыя, лірычныя песні, балады і рамансы, гістарычная і рэвалюцыйная песні, частушкі і прыпеўкі, будуць аддадзены асобныя тамы.

Некалькі тамоў складуць казкі — аб жывёлах, чарадзейныя, сацыяльна-бытавыя і інш.

Па адным томе адведзена на дзіцячы фальклор, замовы, легенды, паданні і сказы, анекдоты і жарты, народныя загадкі. Асобны том складуць прыказкі, прымаўкі і выслоўі.

Выданне забяспечана грунтоўным навуковым і даведачным апаратам. Кожнай жанравай групе будзе папярэднічаць уступны артыкул, усе тэксты будуць падрабязна пракаменціраваны. У каментарыі абавязкова падаюцца асноўныя звесткі пра месца і ўмовы бытавання тэксту, крыніцы публікацыі, асноўны тэкст супастаўляецца з варыянтамі.

Песенныя тэксты і тэксты, якія вымагаюць музычнага суправаджэння ў многіх выпадках будуць пададзены разам з нотнымі запісамі.

Усе тэксты твораў будуць публікавацца ў адпаведнасці з сучасным правапісам. Фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці народнай гаворкі захоўваюцца толькі тады, калі гэтага патрабуе мастацкая форма твора (рыфма, рытм і г. д.).

І, нарэшце, пра тэрміны выдання. Збор беларускага фальклору мы мяркуем выдаваць серыйна. У бліжэйшыя пяць-сем гадоў будзе выпушчана першая серыя з 15 тамоў.

Першы том выйдзе ў 1970 годзе — да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. У гэтым томе будуць змешчаны беларускія народныя песні савецкага часу, сярод іх — песні, прысвечаныя Леніну, партыі, Радзіме.

Услед за ім выйдзе том гістарычных і рэвалюцыйных песень, потым — тамы жніўных песень, песень веснавога і восеньскага цыклу, радзіннай і вясельнай паэзіі, лірычных песень, сацыяльнай лірыкі, частушак, сатырычных і жартоўных песень, некалькі тамоў казак, том загадак і г. д.

Большасць тамоў гэтай серыі падрыхтавана ўжо да друку, завяршаецца праца і над астатнімі.

— Не сумняваемся, — сказаў у заключэнне П. Глебка, — што выхаду шматтомнага Збору твораў беларускага фальклору чакаюць шматлікія чытачы і што яго з радасцю сустрэне і наша літаратурная грамадскасць, і вучоныя, выкладчыкі, студэнты, аматары мастацкай самадзейнасці, і шырокія колы чытачоў, якім дорага вусна-паэтычная творчасць беларускага народа.

ТРОХІ больш года прайшло з часу рэспубліканскай мастацкай выстаўкі, прысвечанай 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. За гэты параўнальна невялікі тэрмін беларускія жывапісцы, графікі, скульптары, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва стварылі шмат новых работ. Лепшыя з іх склалі экспазіцыю выстаўкі «50 год БССР і КПБ». Ужо той факт, што яна — не рэтраспектыўная, паказальны. Ён сведчыць пра творчую актыўнасць нашых майстроў пэндзля і разца, пра неадольнае іх жаданне паказаць у мастацкіх вобразах гістарычныя шляхі і сённяшні дзень роднага народа, вышыні, якіх дасягнуў ён у барацьбе і працы.

Перад намі ажываюць незабыўныя вобразы правадыра Кастрычніцкай рэвалюцыі У. І. Леніна («Апасіяната» Р. Кудрэвіча і А. Гугеля, «Перад бурай» А. Заборава), змагароў за справу Кастрычніка — герояў грамадзянскай вайны («Беларусь Савецкая» А. Шыбнёва, «Разведка пад Баранавічамі» (Г. К. Арджанікідзе) Б. Уса, «1920 год. Продатрад» Л. Асядоўскага), першых камунараў і арганізатараў калгаснага ладу («Агітатары на вёсцы» В. Кубарава, «Першая камуна ў БССР» П. Крохалева, «Перад сходам. 1929 год» А. Мазалёва), франтавікоў і партызан Вялікай Айчыннай вайны («Партызанскае вяселле» М. Данцыга, «Легенда пра бацьку Міная» М. Савіцкага, «Партызанская сям'я» Ф. Бараноўскага, «Бярозавы сок» М. Палянкова, «Маці партызанская» А. Малішэўскага).

А побач з імі — вобразы дакастрычніцкага мінулага («Георгій Скарына» І. Давідовіча, «Паўстанне сялян» М. Беляніцкага), героі нашага часу — ветэраны, якія прайшлі з рэспублікай суровыя выпрабаванні ў барацьбе за новы, савецкі лад жыцця, і моладзь, якая не зведала, што такое агонь і порах, — дзеці і гераічнай радасці бацькоў.

Мастакі асэнсоўваюць сучаснасць у яе трывалых сувязях з мінулым, далёкім і недалёкім. Лепшыя творы выстаўкі прасякнуты ўсведамленнем пераемнасці подзвігу пакаленняў савецкіх людзей — будаўнікоў новага жыцця.

РЫСЫ ЧАСУ ЦІ ПРЫКМЕТЫ ДНЯ?

Нататкі з юбілейнай мастацкай выстаўкі

МНЕ хацелася б тут падзяліцца думкамі пра тыя творы жывапісцаў, у цэнтры якіх — чалавек 60-х гадоў дваццатага стагоддзя, чалавек, які сёння побач з намі, жыве праблемамі нашага часу.

Сярод гэтых твораў, на мой погляд, выдзяляецца карціна А. Малішэўскага «Маці» — выразная па думцы і вельмі эмацыянальная. Яна ўражвае пры першым жа знаёмстве. Тут думка і пачуццё ў добрым суладдзі.

...У музейнай зале каля пано японскіх мастакоў Іры і Тасіра Марукі «Хірасіма» — савецкія жанчыны. Іх многа — мацярок, сясцёр, жонак, дачок нашых. У тварах і жэстах жанчын — трывога, /пратэст супраць таго, што адбылося ў жніўні сорак пятага ў Японіі. Разнастайныя градацыі і адценні пачуццяў сваіх персанажаў жывапісец выяўляе колерам, у якім быццам растварaецца сам малюнак. Можа быць, не ўсе элементы кампазіцыі прадуманы да канца (так, мне здаецца, не вельмі пераканаўчы жэст жанчыны з узнятай рукой у левай частцы палатна, кідаецца ў вочы некаторая немаштабнасць фігуркі дзяўчынкі ў адносінах да фігур жанчын). Можа быць, не зусім дакладна знойдзены прасторавыя суадносіны паміж групай жанчын і фрагментам пано. Але твор «гучыць». Бо ў ім пульсуе надзённейшая ідэя барацьбы за мір, супраць атамнай смерці. Тут пачуцці і думкі выказаны шчыра, пераканаўча. Светапогляд, светаразуменне мастака выразна выяўлены і ў вобразным ладзе палатна, і ў інтэрпрэтацыі тэмы, і ў шырыні разумення законаў формаўтварэння, пры якіх форма падначальваецца ідэі твора. У карціне больш строгі, чым быў раней у А. Малішэўскага, жывапісны «голас», выверaны, прадуманы.

Сярод лепшых твораў аб працоўных буднях нашых сучаснікаў — карціна Г. Паплаўскага «Здабытчыкі. Вахта тралмайстра Туманава». Яна напісана па ўражаннях ад падарожжа ў Атлантыку на савецкім рыбалоўным траўлеры. Аб працаўніках мора былі і вядомыя графічныя лісты Г. Паплаўскага. У карціне ж з'явілася нешта істотна новае ў падыходзе мастака да раскрыцця сучаснага характару. І гэта звязана не толькі з магчымасцю маляўніча перадаць своеасаблівы, стрыманы шэра-фіялетавы каларыт, характэрны, напэўна, для акіяна. Істотней сама магчымасць больш экспрэсіўнай падачы вобразаў, абагуленых, манументалізаваных. Выразна перададзены стан персанажаў. Мастак не паддаўся спакусе знешне эфектнай падачы сюжэта, на якую б магла наштурхнуць яго рамантыка абранай тэмы. Вобразны лад карціны гранічна суровы, стрыманы. Пачуццё ўласнай годнасці і прастата, мужнасць і воля — вось асноўныя рысы герояў гэтай карціны Г. Паплаўскага. Некаторыя недахопы фармальнага парадку ў якойсці меры зніжаюць добрае ўражанне ад работы (у карціне «не чытаецца» мора, ад чаго тросы, якія ідуць да мачтаў, засталіся адзіным сведчаннем месца дзеяння).

Героі палатна М. Савіцкага «Рабочыя» — таксама людзі 60-х гадоў. Яны розныя і па ўзросту, і па характарах, і па думках. Па сутнасці, кожны з персанажаў карціны — цэлая біяграфія. Нагадзіва чысты, непасрэдны юнак у левай частцы палатна. Ён, відаць, зусім нядаўна прыйшоў працаваць на завод. Тут жа і пажылы майстра, умудроны жыццёвым вопытам, і маладыя прыгожыя дзяўчаты і хлопцы. Яны сур'ёзныя, засяроджаныя на сваіх думках, гордыя сваёй працай, я б сказаў — інтэлектуальна напоўненыя. А вакол — заводскія канструкцыі, рашоткі, пераходы... На другім плане па верхнім пераходзе ідзе рабочая змена. Адчуванне напружанай думкі пранізвае ўсю кампазіцыю, разлічаную на працяглы разгляд.

Гераічна-прыўзнятаму гучанню палатна служыць і каларыт. Ён высакародна стрыманы, строга падначалены прадметнай верагоднасці адлюстравання. Колеры, рытм — лаканічныя. Фармальныя кампаненты дапаўняюць адзін аднаго ў гэтым творы, «працуюць на думку». На жаль, карціна некалькі перагружана вытворчымі дэталямі, якія нібы сціскаюць людзей.

Хвалюючыя думкі і пачуцці ў аснове карціны Ю. Пучынскага «Памяць». Тэма твора кранае глыбока.

...Зайшло сонца. Людзі — маладыя і старыя, салдаты, рабочыя і студэнты — нясуць і нясуць на высокі ўжо Курган славы жменькі свяшчэннай зямлі, палітай крывёю абаронцаў Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай. А на першым плане жанчына — маці, салдатка, чый муж, брат ці сын аддаў жыццё за Радзіму, за такіх, як яна, жанчын, за такіх людзей, як гэтыя, што аддаюць пашану памяці загінуўшых у бітвах з ворагам. І ў натруджаных руках жанчыны — саджанец дубка, які яна пасадзіць ля кургана...

Як бачым, сюжэт хоць і пазбаўлены знешняга дзеяння, але псіхалагічна ёмкі. І ўсё ж, разглядаючы карціну, пераконваешся, што аўтар не дабіўся той гарманічнай цэласнасці, калі настрой і эмоцыі мастака — у поўнай адпаведнасці з мовай, якой яны выказаны, калі мастак мысліць колерам, рытмам, пластыкай. Цёмны, часам неахайны жывапіс. Кампазіцыйна неапраўданы зрэз галавы жанчыны.

Цікавае па жывапісу палатно Я. Харытоненкі «Сталявары». Пунсовыя водсветы полымя ліцейкі эфектна асвятляюць групу рабочых ля печы, надаюць палатну мажорнае гучанне. Мастак, відаць, не аднойчы назіраў нялёгкую працу людзей гэтай мужнай прафесіі. Але ўзняцца вышэй пратакольнага фіксіравання жыццёвага факту не здолеў. Сюжэт не асвоены эмацыянальна.

Пазбаўлены жывога пачуцця і героі карціны В. Савіцкага «У хвіліну адпачынку». У гэтым творы няма ні інтэлектуальнага, ні эмацыянальнага пачатку. Як сказаў паэт — «адны законы рамяства»... Такія творы, мне думаецца, з'яўляюцца не з вострай неабходнасці выказаць нешта шчырае, запаветнае, а з-за так званай «актуальнасці тэматыкі».

Ёсць яшчэ на выстаўцы тры творы розных мастакоў пра нашых маладых сучасніц. Характэрна, што ўсе яны называюцца аднолькава трафарэтна — «Дзяўчаты». Гэта, мне думаецца, не выпадкова. Адна агульная рыса аб'ядноўвае гэтыя творы М. Сеўрука, І. Рэя, Л. Ізмайлавай — пазбаўленне чалавека канкрэтных, індывідуальных, запамінальных рыс. Няма ў палотнах палёту адухоўленай думкі, шчырасці, эмацыянальнасці. І калі ў гераінь М. Сеўрука ўсё ж ёсць пэўная пластычная прыгажосць, а ў Л. Ізмайлавай прыгожа знойдзены рытм, то ў І. Рэя цяжка знайсці штосьці свежае, паэтычнае, не стандартнае хоць бы ў кампазіцыі ці ў самім жывапісу.

Невыразнасць задумы псуе ўражанне і ад цікавага па жывапісу палатна Х. Ліўшыца пра свята беларускай вёскі «Гулянне ў Пільніцы». З першага погляду на гэтае палатно ўзнікае святочны настрой. Можа, за кошт маляўнічасці касцюма дзяўчыны ў цэнтры палатна, можа, за кошт рэзкіх кампазіцыйных ракурсаў і складанай, цікавай перспектыўнай пабудовы. Вабяць і нядрэнна напісаныя вясковыя домікі, групы людзей, неба. Але характары персанажаў не распрацаваны, пазбаўлены глыбіні. Дзяўчына ў цэнтры проста пазіруе. Невыразны вобраз салдата, які глядзіць на дзяўчыну. Нават калі б яго не было — у кампазіцыі нічога істотнага не змянілася б.

Шматфігурную маляўнічую кампазіцыю «На беларускім вяселлі» паказаў Л. Шчэмелеў. Нягледзячы на кампазіцыйныя і каларыстычныя ўдачы, карціна не стала крокам мастака наперад. І прычына, відаць, у тым, што фармальныя прыёмы заглушылі тут саму задуму. Прыкрыя недахопы ў малюнку (хоць Л. Шчэмелеў выдатны рысавальшчык) таксама адмоўна паўплывалі на агульную выразнасць твора, знізілі яго настрой. І ў выніку падрабязна абмаляваныя персанажы — жаніх, нявеста, госці, бацькі, трапна ўгледжаныя дэталі сельскага быту, калгасныя палі, што ідуць за гарызонт, не складваюцца ў выразны мастацкі вобраз.

Народнае свята паказана і ў карціне В. Сахненкі «Наша свята». Па-свойму ўвасабляючы выбраную тэму, паказваючы радасць жанчын-калгасніц, якія сабралі багаты ўраджай, мастак шмат увагі аддаў дэкаратыўнасці каларыту, своеасаблівай лірыцы нацюрморта, а гэта, на жаль, адцясніла на другі план людзей — не перададзена іх індывідуальнасць, страчаны адценні настрою кожнага з персанажаў.

Рукою майстра, які ўмее добра кампанаваць, валодае каларытам, напісана вялікае палатно А. Шыбнёва «Гарачыя дні». Яно прысвечана працоўным будням калгаснікаў. Але мастак дае чыста знешнюю характарыстыку з'явы. Твор пазбаўлены глыбокага роздуму, вобразы людзей не сагрэты ўнутраным пачуццём. На маю думку, недастаткова выяўлены тут прыкметы часу — гэта могуць быць і нашыя дні, і пяцідзесятыя гады. А твор павінен трывалей быць «прапісаны ў часе».

СЦВЯРДЖЭННЕ высокага гонару савецкага чалавека, яго творчай працы, багатага духоўнага свету — вядучы матыў не толькі тэматычных карцін, але і партрэтаў, якіх на выстаўцы багата. Тут і студэнты, і рабочыя, і дзеячы навукі і культуры. Словам, галерэя герояў нашага часу — досыць разнастайная. Жаданне дайсці «да самай сутнасці», зразумець думкі, настроі, пачуцці сваіх сучаснікаў і падзяліцца вынікамі свайго пазнання з гледачом выразнае ў партрэтах Н. Воранава «Заслужаны артыст БССР Я. Рамановіч», Л. Дударэнкі «Бабка Агата з унучкай», Б. Кузняцовай «Мае сучаснікі», Я. Зайцава «Пятрусь Броўка», І. Бароўскага «Партрэт прафесара І. Сасновіна». Шырокая, свабодная трактоўка вобраза, ясны пагляд на свет, прыроднае пачуццё рытму, колернай гармоніі — у «Партрэце дачкі» Л. Шчэмелева, адным з лепшых на выстаўцы.

Імкненне да найбольш поўнага раскрыцця ўнутранага свету сённяшняга чалавека актывізуе пошукі партрэтыстаў — усё часцей з'яўляюцца партрэты-карціны. Героі ў іх — у абставінах працы, пэўных прывязанасцей і г. д.

Так, напрыклад, Л. Асядоўскага зацікавіў характар маладога вучонага 60-х гадоў. Гэта чалавек глыбокага розуму, смелай і спелай думкі, яркай творчай і чалавечай індывідуальнасці. На жаль, мастак не пазбег элементаў моднага цяпер паказу вучоных на фоне грыфельных дошак, табліц і іншых атрыбутаў прафесіі. Але многае можна дараваць, калі ўдалося галоўнае — калі раскрыты індывідуальны характар сучаснага вучонага, вызначаны істотныя рысы яго духоўнага складу. Даруеш і некаторую непрапарцыянальнасць частак фігуры. Бо бачыш разумны позірк вачэй, адчуваеш напружаны рытм думкі. Выяўленню яе падначалены і кампазіцыя, і лаканічны, жарсткаваты каларыт. У гэтым партрэце, мне здаецца, ёсць тое, што звычайна называюць гармоніяй інтэлектуальнага і эмацыянальнага.

Групавы партрэт чэмпіёнаў свету па фехтаванні — прыкметная ўдача Я. Красоўскага. Гэта таксама партрэт-карціна. Паўнакроўныя характары — у тыповых для іх абставінах. Думкі мастака арганічна зліліся з яго пачуццямі. У творы верагодная кожная дэталь. Адчуваецца, што мастак глыбока ведае сваіх герояў. Таму кожны з персанажаў партрэта — завершаны па характарыстыцы і ўнутранай, і знешняй.

А вось работы Г. Шэлега («Партрэт П. Салычыца»), П. Явіча («Партрэт А. Лук'яненкі»), У. Сухаверхава («Партрэт Е. Клімчанка»), А. Вайштэйна («Партрэт С. Алесіёнка»), І. Грыгаровіча («Партрэт В. Камарова») не прынеслі радасці адкрыцця. Некаторыя з гэтых партрэтаў уздзейнічаюць на наш розум, прымушаюць думаць, але мала кранаюць сэрца. Яны надта аднатыпныя, у іх не адчуваецца актыўнага падыходу да чалавека.

АКТЫЎНЫ падыход да натуры, жывыя адносіны да прыроды патрабуюцца і ад пейзажыста.

Палотны В. Цвірко «Беларусь мая», «Расцвіла вярба», «Стоўбцы», «Сказ пра Нёман» — маляўнічыя карціны беларускай прыроды, створаныя паэтам сучаснасці.

Уменне востра адчуваць эпічную прыгажосць прыроды іменна па-сучаснаму — неацэнная якасць таленту жывапісца. Скупая нешматслоўнасць кампазіцыі спрыяе стварэнню маштабнага, абагуленага вобраза Радзімы, які яўна перарастае рамкі таго ці іншага канкрэтнага матыву. Мастацтва В. Цвірко глыбока інтэлектуальнае і тэмпераментнае. Яго карціны вабяць маштабнасцю задум, шырынёю абагульненняў, абвостранасцю жывапісных прыёмаў, якія іншы раз пераходзяць нават у непажаданую нарачытую жорсткасць.

У пейзажах-карцінах Б. Аракчэева «Працоўная восень» і «Вясеннія ветры», С. Каткова «Лагойскі матыў» і «Асенні краявід», В. Вярсоцкага «Мой Мінск», Ф. Дарашэвіча «Ускраіна Мінска» і «Адліга», А. Кроля «Прастора», Д. Алейніка «Квітнеюць сады» ёсць той настрой, пра які добра сказаў некалі яшчэ А. Луначарскі: «Гэта тая псіхалагічная музыка, якой павявае ад пейзажа і якую мастак сам уносіць у яго ад паўнаты сваёй лірыкі, свайго перажывання. Тут жывапісец-пейзажыст выступае ў якасці паэта».

І сапраўды, паэзія новага, подых часу гучаць у гэтых пейзажах зусім неназойліва, без імкнення кан'юнктурна прывязаць іх да надзённай тэмы.

Парадавалі на выстаўцы і нацюрморты. Дастаткова спаслацца, напрыклад, на карціну-нацюрморт М. Данцыга. І пластычным рашэннем, і сюжэтам, і абранымі прадметамі мастак наводзіць гледача на роздум аб нашым часе. Гэта сапраўдная аповесць пра сучаснага чалавека, пра яго духоўныя інтарэсы, густы, пачуцці, думкі, побыт. Здаецца, ён толькі што быў тут, за гэтым сталом, дзе яшчэ дыміць цыгарэта, а ў пішучую машынку закладзены аркуш паперы. Здаецца, ён толькі што любаваўся пейзажам, які — за акном. Разумная прадуманасць аб'ёмнапластычных форм, выразная канструктыўная пабудова палатна выклікае ў памяці словы Пятрова-Водкіна аб тым, што нацюрморт — «адна з самых вострых гутарак жывапісца з натурай».

«Вострую гутарку» з натурай вядзе і В. Жолтак: у яе нацюрмортах мы выразна адчуваем наша сённяшняе жыццё, хвалюючую паэзію нашых будняў.

УСЯГО на выстаўцы каля ста жывапісных палотнаў пра нашу сучаснасць. Карціны, партрэты, пейзажы, нацюрморты — разнастайныя па тэматыцы, ступені тыпізацыі вобразаў, эмацыянальным ладзе і па многіх іншых прыкметах, не кажучы ўжо аб разнастайнасці жывапісных почыркаў. У лепшых з іх — неабходная гармонія зместу і формы, задумы і яе ўвасаблення, інтэлектуальнага і эмацыянальнага пачаткаў. Там, дзе гэтая гармонія па тых ці іншых прычынах парушана — мастакоў напаткоўваюць няўдачы.

Глядач чакае ад твораў нашых жывапісцаў вялікага інтэлектуальнага і эмацыянальнага зараду. Ён хоча не толькі ўспрымаць розумам задуму мастака, але і адчуваць, перажываць тое, што мастак хацеў выказаць. Спраўджваць гэтыя спадзяванні гледача — адна з высакароднейшых мэт кожнага з майстроў пэндзля і разца.

Барыс КРЭПАК.

З ЮБІЛЕЙНАЙ МАСТАЦКАЙ



В. ПАСЮКЕВІЧ. АБАРОНЦЫ БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ (масла). Фрагмент.

Падзеі Факты Навіны

ПРЭМ'ЕРЫ НАРОДНЫХ ТЭАТРАЎ

□ Народны тэатр Барысаўскага гарадскога Дома культуры — старэйшы ў рэспубліцы. Яго спектаклі глядзелі працоўныя раёна, Мінска і раду іншых гарадоў рэспублікі. Днямі тэатр паказаў сваю 25-ю прэм'еру — спектакль па п'есе К. Чорнага «Бацькаўшчына».

У спектаклі заняты амаль увесь творчы склад тэатра: майстар аўтарамонтнага завода Анатоль Тушынскі (Леапольд Гушка), загадчык гарадскога аддзела культуры Міхась Славін (пан Ёдка), выхавацельніца школы-інтэрната Галіна Грышкіна (Марылька) і іншыя.

15 гадоў калектывам нязменна кіруе заслужаны дзеяч культуры БССР Ф. Міхайлаў, і 25-ю прэм'еру ставіў Фёдар Мікалаевіч. Афармляў спектакль мастак С. Мірзаян. Ужо многа гадоў над тэатрам трымае шэфства народная артыстка БССР В. Галіна. У пастаноўцы гэтага спектакля яе кансультацыя была надзвычай карыснай.

□ Прэм'ера камедыі «Выбачайце, калі ласка» А. Манаёнка адбылася ў Лідскім гарадскім Доме культуры. Спектакль паставіў рэжысёр народнага тэатра Валянціна Колбушкіна. Галоўныя ролі выконваюць артысты тэатра С. Зялінскі, Л. Беразоўскі, Р. Бутрымовіч, Н. Жоромская і іншыя.

НОВЫ КІНАТЭАТР

У Магілёве адкрыўся новы кінатэатр «Кастрычнік», збудаваны па праекце архітэктара А. Кучарэнкі. Глядзельная зала яго разлічана на 850 месц. Устаноўлена навейшая айчынная кінаапаратура. Пасля ўрачыстага адкрыцця кінатэатра гледачам быў паказан мастацкі фільм «Браты Карамазавы».

А. КІТАЕЎ.

НАВАСЕЛЛЕ АБЛАСНОЙ БІБЛІЯТЭКІ

У Брэсце адчыніў дзверы новы будынак абласной бібліятэкі, у чытальнай зале якой змогуць адначасова займацца 700 чытачоў. У новым будынку бібліятэкі адкрыюцца аддзелы беларускай, сельскагаспадарчай і эканамічнай літаратуры, аддзел каталогаў і кнігасховішча, пераплётная майстэрня. Для правядзення культурна-масавай работы ёсць спецыяльная глядзельная зала з кінастацыянарнай устаноўкай.

І. ДАШЧЫНСКІ.

НОВАЯ МУЗЫЧНАЯ

Цудоўны падарунак атрымалі юныя музыканты Першамайскага раёна г. Віцебска. Тут здадзены ў эксплуатацыю двухпавярховы будынак новай музычнай школы. Гэта 33-я музычная ўстанова ў вобласці.

А. АРЦЁМАЎ.

ВЫЯЗНЫЯ КАНЦЭРТЫ АРТЫСТАЎ-АМАТАРАЎ

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці Аршанскага дома культуры чыгуначнікаў імя Кірава падвялі вынікі сваёй дзейнасці за мінулы год. За гэты час калектыў наладзіў каля сарака выязных канцэртаў і спектакляў. У Гомелі самадзейныя артысты паказалі музычна-літаратурную кампазіцыю, прысвечаную У. І. Леніну.

Канцэрты агітбрыгады адбыліся ў калгасах і саўгасах Аршанскага, Горацкага, Шклоўскага і Талачынскага раёнаў. А народны тэатр чыгуначнікаў выступаў у Віцебску, дзе паказаў фрагменты са спектакля А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў», а таксама ў калгасах Бялыніцкага раёна.

Нядаўна на сцэне Аршанскага дома культуры чыгуначнікаў адбылася прэм'ера спектакля «Сэрца на далоні» па аднайменным рамане І. Шамякіна (рэжысёр В. Давыдоўскі).

Ф. КУЛАКОЎ.

БІБЛІЯТЭКА ІДЗЕ ДА ЧЫТАЧА

У 1967 годзе ў нашай рэспубліцы налічвалася 7199 масавых бібліятэк з фондам у 47 мільёнаў кніг. Кожны год адкрываецца каля дзвюхсот новых бібліятэк. Толькі ў 1967 годзе пачало дзейнічаць 168 сельскіх, 26 дзіцячых і 13 гарадскіх бібліятэк.

Але інтэнсіўнасць росту бібліятэк з цягам часу запаволіцца. І гэта зразумела. Адкрываць новыя асяродкі культуры можна толькі там, дзе іх няма. Вось чаму ўжо цяпер вельмі важна ўпарадкаваць наяўную бібліятэчную сетку. Дробныя, з малым кніжным фондам бібліятэкі, аб'ядноўваюцца, асобныя пераводзяцца ў больш населеныя пункты, пераабсталёўваюцца, для многіх будуюцца новыя памяшканні. Гэта — толькі частка праблемы паляпшэння бібліятэчнага абслугоўвання. Цалкам яе можна вырашыць шляхам арганізацыі шырокай сеткі філіялаў, перасовак, пунктаў выдачы кніг у маланаселеных вёсках.

Работа па развіцці і ўпарадкаванні бібліятэчнай сеткі вядзецца па загадзя распрацаваным плане. Складаецца гэты план на аснове матэрыялаў, сабраных непасрэдна на месцах. У Гомельскай вобласці, напрыклад, вывучалі стан бібліятэчнай сеткі работнікі абласной бібліятэкі і раённага звяна. Яны пазнаёміліся з работай сельскіх бібліятэк і іх філіялаў, вывучалі магчымасць узбагачэння іх кніжных фондаў. Наведвалі і вёскі, дзе няма сваіх бібліятэк. Іх прапановы разглядаліся ў райвыканкомах.

У Быхаўскім раёне Магілёўскай вобласці многія сельсаветы не мелі ў сваіх цэнтрах самастойных (не клубных) бібліятэк, а ў адным — не было наогул. Пасля аналізу сабраных матэрыялаў высветлілася, што ў раёне трэба перамясціць адну бібліятэку, а сем аб'яднаць, адкрыць некалькі новых, трыццаць перавесці з прыклубных у вышэйшы разрад, адкрыць не менш семнаццаці філіялаў.

Розныя непаладкі былі выяўлены і ў іншых раёнах. Вывучыўшы іх, абласная бібліятэка змагла больш правільна размясціць бібліятэкі ў астатніх раёнах. Так было зроблена і ў Гродзенскай вобласці.

Упарадкаванне бібліятэчнай сеткі, натуральна, значна паспрыяла росту колькасці чытачоў. Вось характэрны прыклад. Юравіцкая сельская бібліятэка Дзятлаўскага раёна, якая раней знаходзілася ў аддаленай невялічкай вёсачцы і абслугоўвала каля трохсот жыхароў, была перамешчана ў Баравічы. Чытачоў адразу стала каля тысячы. Або другі прыклад. Шундраўская сельская бібліятэка Гродзенскай вобласці рашэннем выканкома пераведзена ў вёску Паўлава (цэнтр сельсавета). І зона абслугоўвання чытачоў павялічылася амаль у два разы.

Шырока ўкараняюцца ў жыццё нестацыянарныя формы бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва. На сённяшні дзень ад сельскіх бібліятэк працуе пяць тысяч перасовак. У будучым сетку пунктаў выдачы і філіялаў мяркуецца намнога пашырыць. Усё гэта яшчэ больш наблізіць кнігу да чытача.

Гаворачы аб развіцці і ўдасканаленні сеткі бібліятэк, нельга не сказаць і пра ўпарадкаванне іх кніжных фондаў. Зараз каля дзвюхсот сельскіх бібліятэк маюць больш чым па дзесяць, астатнія па пяць-сем тысяч кніг. У сярэднім па рэспубліцы на кожнага жыхара прыпадае па шэсць кніг. Гэта — без уліку навуковых, вучэбных і ведамасных бібліятэк. Калі ўлічыць усё кніжнае багацце рэспублікі, то на аднаго чытача прыходзіцца больш чым па дзесяць кніг.

У апошні час папаўненне бібліятэк вядзецца строга па заказах, прычым улічваецца аб'ём кніжнага фонду і спецыялізацыя бібліятэкі. Для камплектавання фондаў сельскіх бібліятэк выкарыстоўваюцца сродкі калгасаў і саўгасаў.

Усё станоўчае ва ўпарадкаванні і камплектаванні кніжных фондаў мы стараемся шырока распаўсюдзіць, прапагандуем на абласных семінарах. Такі семінар, напрыклад, прайшоў у Магілёве. Удзельнікі яго знаёміліся з вопытам работы Шклоўскай бібліятэкі, якая зарэкамендавала сябе адной з лепшых па распаўсюджванні літаратуры мінулых гадоў выдання. Шмат карыснага пачулі яны ў выступленнях супрацоўнікаў Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя К. Маркса г. Магілёва. Удзельнікі семінара практычна навучыліся весці абмен дублетнымі выданнямі і «няпрофільнай» літаратурай з іншымі бібліятэкамі раёна, як улічваць і задавальняць попыт на рэдкую кнігу.

Паспяхова праводзіцца перамеркаванне кніжных фондаў у Гродзенскай і Гомельскай абласцях. На жаль, не могуць гэтым пахваліцца Віцебская і Брэсцкая вобласці.

Зараз ідзе Усесаюзны агляд бібліятэк, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Нам, бібліятэчным работнікам, трэба прыкласці ўсе намаганні, каб закончыць упарадкаванне бібліятэчнай сеткі, палепшыць камплектаванне кніжных фондаў бібліятэк, каб абслугоўванне чытачоў узняць на больш высокую ступень.

Г. МЕЛАМЕД,
загадчыца навукова-метадычнага аддзела Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна.

ПАКАЗВАЕ ГРОДНА

Напярэдадні паўвекавога юбілею БССР і Кампартыі Беларусі ў Гродна здадзена ў эксплуатацыю абласная студыя тэлебачання. У гутарцы з нашым карэспандэнтам яе дырэктар Я. Карабок расказаў:

— Пуск студыі тэлебачання — значная падзея ў культурным жыцці працоўных Прынёманскага краю. Цяпер два разы на тыдні ў эфіры чуваць пазыўныя тэлестудыі. Акрамя абласнога тэлевяшчання тэлецэнтр забяспечвае прыём тэлепраграм Цэнтральнага і Беларускага тэлебачання па трэцім канале. З завяршэннем мантажных работ на радыёрэлейнай лініі Гродна — Слонім насельніцтва ўсёй вобласці зможа пастаянна глядзець тэлеперадачы нашай студыі.

Малады калектыў тэлестудыі робіць свае першыя творчыя крокі, і яны паказалі, што мы зможам зрабіць многае ў справе камуністычнага выхавання працоўных, прапаганды ленінскіх ідэй, дапамагчы творчым калектывам дастойна сустрэць знамянальную дату ў жыцці нашага народа — 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна.

Ленінская тэматыка — асноўная зараз на ўсёй нашай дзейнасці. Для яе вырашэння мы будзем выкарыстоўваць усе сродкі і магчымасці тэлебачання. Сюды ўваходзяць выступленні знатных людзей Гродзеншчыны, расказы і ўспаміны старых камуністаў, тых, хто са зброяй у руках адстойваў заваёвы Вялікага Кастрычніка, выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці, прафесіянальнага і народных тэатраў, музыкантаў, кампазітараў, пісьменнікаў, партыйных і савецкіх работнікаў.

УЗРОСТ СТАЛАСЦІ

НАРОДНЫ ансамбль песні і танца «Дняпро» Рэчыцкага Дома культуры вядомы сваімі выступленнямі ва ўсёй Беларусі. Днямі танцавальны калектыў ансамбля адзначыў свой дваццацігадовы юбілей.

Асаблівых поспехаў дасягнулі аматары самадзейнага мастацтва тады, калі прыйшоў кіраваць калектывам Васіль Мікалаевіч Сакалоў.

За мінулыя гады В. Сакалоў паставіў больш 75 танцаў. Гэта «Лявоніха» і «Крыжачок», «Беларускі карагод» з песняй «Дываночак», ванальна-харэаграфічная кампазіцыя Ю. Семянякі «Радасць беларускіх нафтавікоў» і шмат іншых.

У 1963 годзе калектыву мастацкай самадзейнасці Рэчыцкага Дома культуры было прысвоена ганаровае званне — народны ансамбль песні і танца «Дняпро». Яшчэ раней, у 1960 годзе, В. Сакалову нададзена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры БССР.

Танцавальны калектыў ансамбля з'яўляецца сапраўдным метадычным цэнтрам па харэаграфіі ў горадзе і раёне. Многія ўдзельнікі гэтага калектыву самі ўжо сталі арганізатарамі танцавальных гурткоў на прадпрыемствах і ў школах Рэчыцы, кіраўнікамі гурткоў па вывучэнні бальных танцаў. А некаторыя танцоры, як Лідзія Каласоўская, Кацярына Гузава, Арнольд Кавальчук, Святлана Савіна і іншыя, закончылі культасветвучылішчы.

Рэчыцкія аматары танца паказалі ў час Усесаюзнага фестывалю мастацкай самадзейнасці, прысвечанага 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, і ў час Рэспубліканскага агляду, прысвечанага юбілею рэспублікі, цікавыя і маляўнічыя праграмы. Усяго за мінулы год танцавальны калектыў ансамбля даў больш ста канцэртаў.

Зараз самадзейныя артысты рыхтуюць новую танцавальную праграму святочных канцэртаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Гэты рабочы момант я зняў на чарговай рэпетыцыі. Першы справа — В. Сакалоў.

М. ДЗЕГЦЯРОЎ,
супрацоўнік рэчыцкай раённай газеты «Дняпровец».





Гэты здымак зроблены ў Гомельскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна. Тут захоўваецца кніжны фонд князя Паскевіча. У ім — рукапісы на мовах народаў Усходу, помнікі дыпламатычных зносін, мастацкая літаратура на рускай, польскай, французскай, англійскай, персідскай мовах, а таксама архіў князя Варанцова. Усяго ў кніжным фондзе каля 8 тысяч тамоў.

Загадчыца аддзела кнігасховішча Раіса Варганава, якую вы бачыце на здымку, — гаспадыня гэтага унікальнага кніжнага збору.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

НАДРУКАВАНА Ў «ПОЛЫМІ»

ГАНЬЧЫН СВЕТ

У МАЛАДОСЦІ мала каго з нас усур'ёз займае, а тым больш хвалюе наша мінулае. Але чым далей мы адыходзім ад яго, тым мацней яно прыцягвае нашу ўвагу. Звычайна гэта абвостраная цікавасць да мінулага праяўляецца ў пару нашай духоўнай сталасці. Хто ты і адкуль ты прыйшоў? Што зрабіла цябе такім, якім ты ёсць? І што дапаможа табе стаць такім, якім ты хочаш зрабіцца?

Такім уступам я не збіраюся атоесамліваць гераіню аповесці Алены Васілевіч «Новы свет» («Полымя» № 10) Ганьку Гурновіч з самою пісьменніцай, а аповесць выдаваць за пісьменніцкую аўтабіяграфію. Я ўсяго толькі спрабую высветліць прычыну, па якой пісьменніка сталага веку раптам пацягнула да гадоў дзяцінства і юнацтва і чаму чытачы з удзячнай увагай сустракаюць гэту кнігу.

Чытачы ўжо ведаюць Ганьку па першых дзвюх аповесцях Алены Васілевіч — «Расці, Ганька» і «Доля знойдзе цябе». Знаёмства гэта было цікавае і, натуральна, прыемна было яго прадоўжыць. Прадаўжэннем і з'явілася трэцяя кніжка — «Новы свет», у якой расказваецца аб тым, як Ганька паступае ва ўзорную школу, заканчвае там сем класаў і адпраўляецца ў горад Слуцк паступаць у тэхнікум.

Як і ў папярэдніх кнігах, у гэтай свет Ганькі прадстае перад намі ў яе, Ганьчыным, успрыняцці. Аўтар нібы ні ў што не ўмешваецца, нічога не тлумачыць. Ганька сама і разглядвае свой свет, і малюе яго, і тлумачыць, як умее. І па тым, што ёй у гэтым свеце не па душы і што выклікае яе замілаванне, мы бачым і адчуваем, як дарослее Ганька, як пашыраецца і багацее яе духоўнае жыццё, як яна становіцца больш строгай да сябе, больш уважлівай — да людзей.

Свет, у якім нарадзілася і падрастае Ганька, невялікі, але для яе ён — краіна. Краіна яе маленства. І ў гэтай краіне, як і ў любой іншай, ёсць людзі добрыя і людзі злыя, ёсць свае радасці і засмучэнні.

Успомніце, як апісана гэта краіна — вёска Зялёная Дуброва ў першых дзвюх аповесцях. Дзед Грысь, напрыклад, злы і несправядлівы, за што Ганька ненавідзіць яго, як можа. Цётка Іваніха і яе дочкі — добрыя і ветлівыя людзі, з імі заўсёды лёгка і весела. Дзядзька Мікалай добры і справядлівы, толькі ён баіцца сваёй жонкі — цёткі Фядоры. А цётка Фядора вельмі ўжо ганарыцца сваім дастаткам, сваёй «уласнай ваўначоскай», дзецьмі і працавітым, хоць, на яе погляд, і неразумным дабраком-мужам.

Ёсць у гэтым свеце і свая святая, пакутніца-маці, якая любіць упрыгожваць свой дом кветкамі і расказвае Ганьцы вершы. Аб той горкай долі, да якой давёў Ганьчыну маці бацька, што кінуў іх, Ганька пакуль яшчэ толькі здагадваецца. Зразумець такое пакуль немагчыма, як немагчыма маленькай Ганьцы паверыць, што абодва яны, і маці і бацька, паміраюць, знікаюць назаўсёды.

Былі ў той краіне Ганьчынага маленства і свае цуды. Напрыклад, цуд прыгажосці — дыван над ложкам суседзяў! «На ўсёй вёсцы ні ў кога няма такога дывана... Леў з велізарнай чорнай грывай і закручаным абаранкам хвастом расцягнуўся на паўсцяны. Унізе пад ільвом — возера. Па возеры плаваюць лебедзі. А на беразе возера, спусціўшы ногі ў ваду, сядзіць прыгажуня і пасміхаецца таму ільву і тым лебедзям».

А пазней, калі Ганька ўжо крыху падрасла і навучылася чытаць, паявіцца яшчэ адзін цуд — «цыратовы сшытак-песеннік яе стрыечнай сястры Веры». У тым сшытку, упрыгожаным галубкамі і незабудкамі, — шчымлівыя і прыгожыя песні пра каханне: «Пускай могила меня накажет», а таксама «Маруся отравилась»... Мала хто з нас не зведаў у свой час уздзеяння такіх вось чараў. Лепш бы іх, вядома, не было. Няхай бы лепш у сястры Веры быў сшытачак з вершамі Максіма Багдановіча. Аднак жа былі лебедзі і была Маруся, якая атруцілася па прычыне мужчынскай вераломнасці. А потым Ганьцы яшчэ трэба было вызваляцца ад гэтых сваіх першых зачараванняў.

У «Новым свеце» Ганька ўжо выходзіць за межы краіны свайго маленства. Яна вучыцца цяпер у мястэчку, у школе імя Горкага. Колькі гордасці і захаплення ў яе расказах пра гэту ўзорную школу імя «вялікага пралетарскага пісьменніка»! І колькі зайздрасці ў вачах зялёнадуброўскай малечы, якая слухае, разявіўшы рот, Ганьчыны расказы! А якія настаўнікі ў Ганькі: вядома, ва ўзорнай школе і настаўнікі ўзорныя. І хоць мы з вамі не зялёнадуброўская малеча і ведаем, што Ганька крышачку перабольшвае наконт настаўнікаў, усё роўна ясна — яна шчаслівая ў сваім новым жыцці.

Праўда і тое, што кватэра ў Ганькі благая, гаспадыня ледзь не кожную ноч усчыняе бойкі са сваім маладым мужам. Праўда, што яна сумуе па сваёй Зялёнай Дуброве, па доме цёткі Іваніхі. Не ўсё добра ў Ганьчыным свеце, не ўсё зразумела. Незразумела, чаму асудзілі на тры гады добрага і ціхмянага Валодзю — хіба ж ён вінаваты, што кабыла Пальма спалохалася аэраплана, панесла і разбіла калёсы? Чаму, напрыклад, не хоча ўступаць у калгас былы герой-чапаевец Іван Васілёк?.. Расце Ганька. І чым далей, тым больш пытанняў узнікае ў яе.

Расце Ганька. Змяняюцца і яе ўяўленні аб прыгажосці. У памяці яе цяпер ужо займаюць месца дзіўныя радкі: «Унылая пора, очей очарованье...» Новае прарастае і ў поглядах Ганькі на людзей. Ганька — прасталінейная і катэгарычная ў сваіх адносінах да дзеда Грыся («Расці, Ганька»), у сваіх меркаваннях пра цётку Фядору («Доля знойдзе цябе»), — у «Новым свеце» саступае месца Ганьцы, ужо здольнай да той мудрасці, дабраты, якая прыходзіць з пасталеннем, з вопытам. Цяпер ужо Ганька наўрад ці жадала б смерці злоснаму дзеду, а цётку Фядору (хоць і не забылася Ганька на свае сіроцкія крыўды) яна шкадуе як чалавека, з якім лёс абышоўся вельмі ўжо крута. Як умее, дапамагае добрая Ганька старой адзінокай цётцы.

Ганька — натура вельмі эмацыянальная, актыўная. Усё, аб чым яна расказвае, поўніцца захапленнем, душэўным хваляваннем, падказана сваім асаблівым стаўленнем да свету, да людзей — уважлівым, любоўным, гнеўным, часам насмешлівым.

На дзіва добра, празрыста, лёгка чытаюцца раздзелы, у якіх Ганька расказвае пра цётку Фядору, цётку Іваніху, сястру Сашу.

Добрай і ласкавай усмешкай асветлены ў яе расказе вобраз старшыні калгаса Соскіна, чалавека гарадскога, які не вельмі разбіраецца ў сельскай гаспадарцы, але затое проста і з павагай прыслухоўваецца да парад калгаснікаў, і таму яго паважаюць, нягледзячы на многія смешныя і дзіўныя яго якасці.

У раздзеле «Акадэмія» з той жа добрай, ласкавай усмешкай расказана пра тое, як Ганька вучыць грамаце дарослую жанчыну — цётку Мар'ю: Ганька ўдзельнічае ў лікбезе. Паблажліва і кпліва гаворыць яна пра ветэрынарку Марыю Паўлаўну, новую кватэрную гаспадыню Ганькі. У насмешлівасці, якая прыйшла на змену ранейшаму захапленню Ганькі гэтай прыгожай гультайкай, з яе гітарай і раманамі, праглядвае ўжо тая зоркасць, якая ўсё часцей дапамагае Ганьцы адрозніваць прыгажосць сапраўдную ад уяўнай. Усе гэтыя раздзелы падкупляюць праўдзівасцю і дакладнасцю. Тут адчувальна і строга папрацаваў патрабавальны густ мастака.

На жаль, ёсць у аповесці і не вельмі ўдалыя старонкі — раздзелы «Іспанія», «Забілі Кірава», «Гартаванне». Няма ў іх жывой, эмацыянальнай, лірычнай Ганькі, якая актыўна і зацікаўлена назірае і тлумачыць свой свет. Так і здаецца, што матэрыял для гэтых раздзелаў здабываўся ў тым адсеку памяці, дзе захаваліся толькі падзеі і факты, а не пачуцці.

Застаецца пад канец сказаць, што прачытаная мною аповесць А. Васілевіч — кніга, якая расказвае аб мінулым аднаго чалавека, — несумненна, будзе цікавай для многіх людзей. І асабліва для тых, хто рос і сталеў у тыя ж часы, калі і Ганька, і для каго гэта спатканне з мінулым заўсёды адгукаецца радасцю і смуткаваннем.

І. КЛІМАШЭЎСКАЯ.

ТВОРЫ ЛІТОЎСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ — НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У Вільнюсе выйшла кніга бібліёграфаў Суламіты Ліравене і Віктораса Ліроваса «Літоўская мастацкая літаратура на мовах народаў СССР». Вялікую цікавасць у гэтым зборніку ўяўляе беларускі раздзел, які складаецца больш як з дзвюх дзесяткаў старонак. Тут адлюстраваны ўсе творы і асобныя выданні кніг літоўскіх пісьменнікаў, якія выйшлі ў нашай рэспубліцы за чвэрць стагоддзя (з 1940 па 1965 гг.).

Адразу пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Літве ў газеце «Літаратура і мастацтва» (10.VIII.1940 г.) былі надрукаваны вершы літоўскай народнай паэтэсы Саламеі Нерыс. А ў 1965 годзе ў Мінску выйшла кніга вершаў Эўгеніюса Матузявічуса. За гэтыя дваццаць пяць гадоў на беларускую мову перакладзена дзесяць кніг літоўскіх пісьменнікаў, а ў газетах і часопісах надрукавана больш як 250 асобных твораў літоўскай прозы, паэзіі і фальклору. У спісе перакладчыкаў — імёны П. Броўкі, М. Танка, А. Астрэйкі, А. Бялевіча, С. Грахоўскага, М. Лужаніна, М. Калачынскага, А. Вялюгіна, А. Звонака, К. Кірэенкі і многіх іншых беларускіх празаікаў і паэтаў.

У сваю чаргу пісьменнікі братняй рэспублікі не засталіся ў даўгу. За гэты час у Літоўскай ССР выдадзены кнігі Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, Я. Брыля, М. Калачынскага і многіх іншых беларускіх літаратараў, шмат твораў надрукавана ў часопісах і газетах.

Гэта — яшчэ адно сведчанне дружбы літаратур народаў-братоў.

С. ВАНІН.

КОНКУРС ПАЧЫНАЮЧЫХ ЛІТАРАТАРАЎ

У Салігорску выдаюцца дзве газеты: раённая «Шахцёр» і шматтыражная «За камуністычную працу». Пры абедзвюх рэдакцыях працуюць літаратурныя аб'яднанні. «Вясёлкай» назвалі сваё аб'яднанне пачынаючыя паэты і празаікі, якія групуюцца пры шматтыражнай газеце. Раз у месяц друкуюцца літаратурныя старонкі. Пачынаючыя літаратары выпусцілі тры рукапісныя зборнікі сваіх твораў.

Летась рэдакцыі раённай і шматтыражнай газет разам з гаркомам камсамола аб'явілі конкурс на лепшы мастацкі твор. Падведзены вынікі гэтага конкурсу. Прэмій удастоіліся літаратурны супрацоўнік газеты «Шахцёр» Л. Якубовіч і работнік прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча будаўнікоў А. Крывіцкі. Граматамі гаркома камсамола ўзнагароджаны пачынаючыя аўтары Я. Ціценка, В. Міклашэвіч, Л. Навіцкі і У. Пратасеня.

М. САЛАЎЁЎ.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Іван Навуменка. Якуб Колас. Духоўны воблік героя. Мастак І. Бялецкі. 1968 г. Тыраж 3.000 экз. 336 стар. Цана 74 кап.

Уладзімір Паўлаў. Пажарніца. Аповесць. Мастак М. Пракапенка. 1968 год. Тыраж 15.000 экз. 76 стар Цана 12 кап.

Піліп Пестрак. Слова пра Мінск. Паэма. Мастак І. Немагай, 1968 год. Тыраж 3.800 экз. 40 стар. Цана 10 кап.

Васіль Хомчанка. Чырвоныя хвалі. Аповесць. Малюнкі М. Пракапенкі. 1968 г. Тыраж 15.000 экз. 156 стар. Цана 31 кап.

Рыгор Набатаў. Юнацтва, апаленае агнём. Аповесці. Мастак Л. Дубар. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 75.000 экз. 336 стар. Цана 54 кап.

Алесь Пальчэўскі. Былі ў маці сыны. Апавяданні. Замалёўкі. Успаміны. Мастак Л. Асецкі. 1968 г. Тыраж 8.000 экз. 256 стар. Цана 40 кап.

Салдатамі былі ўсе. Зборнік. Складальнікі: І. Гаўрылаў, І. Мігулін, І. Сцепанцоў, Л. Чэрнічэнка. Мастак Ю. Архіпаў. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 50.000 экз. 408 стар. Цана 88 кап.

Песні аб Леніне і партыі. Мастацкай самадзейнасці. 1968 г. Тыраж 12.000 экз. 40 стар. Цана 25 кап.

Эстрадныя песні. Мастацкай самадзейнасці. 1968 г. Тыраж 8.500 экз. 56 стар. Цана 37 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»

Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць. Альбом-выстаўка. Складальнікі Н. Ватацы і А. Лойка. Афармленне А. Сапеткі. 1968 г. Тыраж 8.000. Цана 38 кап.

Васіль Вітка. Казкі. Школьная бібліятэка. Мастак Б. Ермачонак. 1968 г. Тыраж 35.000 экз. 168 стар. Цана 41 кап.

Сяргей Грахоўскі. Вершы. Школьная бібліятэка. Мастак Л. Чурко. 1968 г. Тыраж 14000 экз. 228 стар. Цана 43 кап.

Для шчаслівай дзетвары. Зборнік. Складальнік Р. Аляскоўская. Мастак А. Дэмарын. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 70 000 экз. 184 стар. Цана 46 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАВУКА І ТЭХНІКА»

М. Лазарук. Станаўленне беларускай паэмы (Жанр паэмы і некаторыя асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў першай палавіне XIX ст.) Мастак Л. Усачоў. 1968 г. Тыраж 1.450 экз. 198 стар. Цана 78 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»

Ф. Янкоўскі. Беларуская фразеалогія. Фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне. 1968 г. Тыраж 2.000 экз. 451 стар. Цана 47 кап.

М. Гурскі, М. Булахаў, М. Марчанка. Беларуская мова, ч. 1. Лексіка, фанетыка і марфалогія. Выданне другое, выпраўленае. 1968 г. Тыраж 5000 экз. 408 стар. Цана 90 кап.

Б. Касоўскі. Агульнае мовазнаўства. Фанетыка, фаналогія, граматыка. Вокладка мастака Г. Важнова. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 5.000 экз. 276 стар. Цана 59 кап.

В. Молакаў. Філасофія сучаснага праваслаўя. Крытычны нарыс. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 3.000 экз. 240 стар. Цана 87 кап.

БАГАЦЦІ РОДНАЙ МОВЫ




За апошнія гады дыялектолагі Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа Акадэміі навук БССР абследавалі ўсе жывыя гаворкі Беларусі. На аснове 1200 тамоў сабраных матэрыялаў была выдадзена капітальная праца «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы». У мінулым годзе, напярэдадні 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі, супрацоўнікі інстытута падрыхтавалі і здалі ў друк манаграфію «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак».

На здымку, які зрабіў фотакарэспандэнт БЕЛТА І. Зміторовіч, супрацоўнікі інстытута (злева направа) доктар філалагічных навук Н. Вайтовіч, кандыдат філалагічных навук А. Арэшанкава, доктар філалагічных навук Ю. Мацкевіч, кандыдат філалагічных навук А. Рамановіч, малодшы навуковы супрацоўнік І. Кавальчук і кандыдат філалагічных навук М. Бірыла праглядаюць першыя экземпляры новага выдання.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

ДУША ПЕСНІ

КАМПАЗІТАРУ ІВАНУ КУЗНЯЦОВУ — 50 ГАДОЎ



Мы сядзім з Іванам Іванавічам у яго дома. Гутарым, успамінаем, думаем...

На стале — ноты: песні, дзесяткі песень. І ўсе яны прысвечаны Уладзіміру Ільічу Леніну. Лепшыя з іх увойдуць у зборнік «Славім Леніна, партыю славім», які выдавецтва «Беларусь» выпускае ў свет да 100-годдзя з дня нараджэння правадыра. У зборніку будуць песні А. Багатырова і Л. Абеліёвіча, І. Лучанка і Я. Цікоцкага, М. Аладава і Э. Тырманд, Ю. Семянякі і У. Алоўнікава, Я. Дзягцярыка і кампазітараў-аматараў.

Цікаўлюся, якія творы самога І. Кузняцова ўвойдуць у ленінскі зборнік. Іван Іванавіч ідзе да фартэпіяна і іграе тры новыя песні. І мне мімаволі прыгадваюцца словы аднаго старшыны з пагранічнай заставы, дзе аднойчы выконваліся некаторыя «салдацкія» творы І. Кузняцова. Старшына — ветэран вайны, чалавек, які сам добра спявае і разумее песню, сказаў: «Гэты аўтар адчувае душу песні... Душу! Таму і піша так сардэчна. Правільна піша!»

У слова «правільна» воін, відаць, уклаў паняцце адчування кампазітарам часу і запатрабаванняў тых, для каго ствараецца музыка. Новыя песні — «Мы з камсамола родам» (словы А. Дзяржынскага), «Таму, што мы камуністы» (словы А. Харкевіча), «Зашуміце, пушчы» (словы А. Русака), з якімі я знаёміўся, таксама былі «правільныя», бо ўраслі карэннямі ў стыхію савецкай вакальнай музыкі, вызначаліся характэрнай для творчасці кампазітара пявучай шчырасцю і пранікнёнасцю, былі «лёгкія» для выканання. Дарэчы, такая «лёгкасць» даецца толькі аўтарам з выдатным кампазітарскім майстэрствам.

Іван Іванавіч Кузняцоў загадчык музычнай рэдакцыі выдавецтва, дэпутат абласнога Савета, сакратар партыйнай арганізацыі і намеснік старшыні праўлення Саюза кампазітараў БССР. Таму я пытаюся, ці хапае ў яго часу на ўсё.

— Недзе я чытаў, — гаворыць Іван Іванавіч, — выказванне Рымскага-Корсакава, што кампазітарам становіцца не той, хто можа пісаць, а той, хто не можа не пісаць. Можа гэта не зусім сціпла, але скажу: а калі так, дык трэба знаходзіць час, каб музыкай выказваць свае думкі. Безумоўна, часу не хапае, але пісаць музыку для мяне ўнутраная патрэба. Да нотнай паперы цягне неабходнасць сказаць нешта запаветнае. Што датычыцца плёну мінулага года, — зразумела, пра якасць творчасці не мне гаварыць! — магу назваць сваю новую, не зусім звычайную кантату «Нёманскі край» на словы Адама Русака. Напісана яна для выканання Беларускім дзяржаўным народным хорам, яго харавой і танцавальнай групамі, інструментальным ансамблем калектыву. Тое, што кантата выконваецца такім складам, і ёсць яе незвычайнасць.

І. Кузняцоў шырока выкарыстаў для гэтага твора тэмы беларускіх народных танцаў «Мяцеліца», «Лявоніха», «Юрачка», карагода «Пойдзем, пойдзем лугам», песні «Перапёлачка». Усе чатыры часткі кантаты выконваюцца без перапынкаў, а трэцяя — танцавальная сцэна — арганічна вынікае з другой — «Народнае свята». Першая частка «Нёманскага краю» — гэта своеасаблівы эпічны расказ пра сённяшнюю Беларусь. Галоўная тэма яе гучыць у фінале — у «Славе», але ўжо ў мажорным ладзе. Усё гэта робіць кантату вельмі цэласнай.

Кампазітар паказаў яшчэ некалькі лірычных песень, а таксама акапэльны хор «Недзе ў лясах Беларусі» на словы украінскай паэтэсы Лады Рэвы пра ўкраінскага хлопца - партызана. Творы гэтыя маюць пэўных адрасатаў - выканаўцаў: песні — артыстку філармоніі Вольгу Шутаву, а хор — нашу Акадэмічную капэлу.

— Зараз у рабоце цыкл хораў, прысвечаных Ільічу. Мяркую выкарыстаць вершы П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка і некаторых маладых паэтаў. Дэталізаваць паэтычны змест цыкла заўчасна. Імкнуся пісаць так, каб слухачы ўспрымалі вобраз жывога Леніна, якім ён узнікае перад кожным з нас у хвіліны роздуму пра краіну, пра народ, пра нашы перамогі.

Улічваючы поспех вядомай кантаты І. Кузняцова «Ленін» — у 1964 годзе яна была надрукавана выдавецтвам «Советский композитор» і запісана на грамафонную пласцінку фірмай «Мелодыя», — хочацца спадзявацца, што і новая творчая задума кампазітара здзейсніцца гэтак жа ўдала.

Як кажуць, пад заслону, калі мы з Іванам Іванавічам развітваліся, ён выказаў яшчэ адну запаветную думку:

— Рыхтую свой першы сімфанічны твор. Пра чалавека, што змагаецца за здзяйсненне сваёй мары. Але гэта вельмі цяжка напісаць. Працаваць трэба будзе шмат...

Што ж, 50 гадоў для мастака — перыяд сапраўднага росквіту таленту, час здзяйснення самых смелых творчых намаганняў. Шчыра жадаю Вам, Іван Іванавіч, перамогі на гэтым цяжкім і высакародным шляху.

І. НІСНЕВІЧ.

МАСТАК І ЯГО ТЭМА

СЦЯПАНУ АНДРУХОВІЧУ — 60 ГАДОЎ



У кожнага сапраўднага мастака заўсёды ёсць свая вядучая тэма творчасці. Ён, бывае, адыходзіць ад яе, але ўсё роўна рана ці позна вяртаецца, узбагачаны новымі думкамі, новымі жыццёвымі ўражаннямі.

Сцяпан Андруховіч упершыню прыняў удзел у выстаўцы ў верасні 1935 года. З таго часу мы ведаем яго як мастака са сваёй тэмай, манерай пісьма. Жыццё калгаснай вёскі, лёс селяніна-беларуса — вось што захапляе і хвалюе яго. Непаўторныя ўспаміны дзяцінства, якое прайшло ў небагатай вёсцы на Міншчыне, і ўражанні ад жыцця сённяшняй калгаснай вёскі натхняюць яго на творчасць.

Вялікая Айчынная вайна на некаторы час перапыніла творчасць мастака, але адразу ж пасля Перамогі Сцяпан Адамавіч зноў шмат ездзіць па Беларусі, падоўгу жыве ў вёсках, вывучае жыццё, піша эцюды... Для кожнага твора знаходзіць новыя дэталі, новыя фарбы, кожнай новай работай даказвае, што выбраная ім тэма сапраўды багатая і змястоўная.

Многім палюбіліся такія карціны Сцяпана Андруховіча, як «Пасляваенная сяўба», «Калгасны статак», «На асушаных балотах», «Калгасны табун» і іншыя. Першае, на што звяртаеш увагу, калі знаёмішся з імі, — прастата матываў: спякотны летні дзень і статак, які збіўся ў кучу, калгасныя забудовы, што праглядваюць праз зеляніну дрэў і хмызнякоў. Мастак смела выяўляе характэрныя асаблівасці пейзажу, уводзіць у яго жанравыя матывы. Гэта асабліва выявілася ў карціне «Пасля працы. Гутарка агітатара».

Аб гэтай карціне можна гаварыць і як аб жанравай, у якой пейзаж служыць неабходным дапаўненнем, і як аб пейзажы, у які вельмі ўдала ўпісана дакладная па дэталях, трапная па характарыстыках персанажаў група людзей. Сюжэт карціны просты. Але твор напісаны з такой цеплынёй і непасрэднасцю, што міжволі адчуваеш сябе ўдзельнікам гэтай сцэны.

Трэба сказаць, што ў многіх работах пейзаж дапамагае мастаку ўбачыць і раскрыць унутраную сутнасць таго, што адбываецца, паказаць кожны куточак прыроды як частку чагосьці вялікага, роднага, бясконца дарагога. У карціне «Лагойскі раён» удала знойдзена спалучэнне гаспадарчых забудоў з прыгожым пейзажам. Ён напісаны шырока, свабодна, у спакойнай жывапіснай гаме.

Сёння, калі на выстаўках мы падыходзім да твораў Сцяпана Адамавіча Андруховіча, бачым, што перад намі — сталы майстар, у якога палюнацку гарачае сэрца, пільнае вока і верная рука.

Р. БАДЗІН.

ЛЕТАПІС ЖЫЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ

ЧАСОПІСУ «БЕЛАРУСЬ» — 25 ГАДОЎ

У рэдакцыйнай шафе, угінаючы сваім цяжарам паліцы, шчыльна стаяць тоўстыя тамы — гадавыя падшыўкі часопіса. Першыя з іх — «маларослыя», з парудзелым ад часу абрэзам, далей — крыху навейшыя, ужо большыя, але танчэйшыя за кошт лепшай паперы, а за імі — доўгая шарэнга тамоў, ужо ў поўным «аганькоўскім» фармаце.

Гэта — часопіс «Беларусь». Дваццаць пяць падшывак — дваццаць пяць гадоў. Гэта летапіс, у якім занатаваны дваццаць пяць апошніх гадоў гераічнага жыцця, працоўнага подзвігу нашай рэспублікі.

Дата яго нараджэння — 1944 год. У той суровы, гістарычны час, калі Савецкая Армія гнала фашысцкія полчышчы на Захад, калі баі разгараліся ўжо на Дняпры і Сожы, беларускі ўрад прыняў пастанову аб выданні ілюстраванага грамадска-палітычнага і літаратурна-мастацкага часопіса, які атрымаў назву «Беларусь».

Некалькі нумароў часопіса выйшла ў свет на рускай мове ў Маскве. У рэдакцыі яго працавалі Міхась Лынькоў, Кузьма Чорны, Пятро Глебка, Васіль Барысенка. Рэдактарам часопіса быў прызначаны Ілья Гурскі.

Адразу ж пасля вызвалення беларускай сталіцы — яшчэ курэлі руіны і папялішчы — рэдакцыя часопіса пераехала ў родны Мінск. І з першых сваіх нумароў «Беларусь» у той час адлюстроўвала бяспрыкладны подзвіг савецкіх людзей па аднаўленні роднай зямлі.

Пасля «Беларусь» з пафасам і ўзнёсласцю вяла рэпартажы з будаўніцтва першынцаў беларускай індустрыі — Мінскіх трактарнага і аўтамабільнага заводаў, пазней — з будаўнічых пляцовак Васілевіцкай і Бярозаўскай электрастанцый, Полацкага нафтаперапрацоўчага і Салігорскага калійнага камбінатаў, з новых гарадоў — Светлагорска і Жодзіна. Нарысамі, аб'ектывам фотаапарата, выступленнямі саміх будаўнікоў «Беларусь» расказвала сваім чытачам аб узвядзенні такіх заводаў-гігантаў, як Гродзенскі азотнатукавы, Гомельскі суперфасфатны, Магілёўскі лаўсанавы, Лідскі лакафарбавы, Бабруйскі шынны, Светлагорскі хімічны і многія, многія іншыя.

Поруч з гэтым часопіс «Беларусь» адводзіў шмат месца паказу поспехаў працаўнікоў сельскай гаспадаркі рэспублікі, апяваў жыццё і побыт земляробаў.

Часопіс «Беларусь», як вядома, у першую чаргу выданне грамадска-палітычнае. Гэта абавязвае яго асвятляць жыццё рэспублікі, яе сённяшнюю рэчаіснасць, яе гістарычнае мінулае. Часопіс інфармуе чытача аб жыцці і вучобе нашых навучальных устаноў, расказвае аб найноўшых дасягненнях навукі і тэхнікі, аб творчым жыцці мастацкіх калектываў, аб дасягненнях у спорце, у ахове здароўя працоўных, паказвае харастаство і красу роднага краю.

Рыхтуючыся да сустрэчы слаўнага юбілею БССР і Камуністычнай партыі Беларусі, часопіс асобныя нумары прысвяціў жыццю абласцей рэспублікі. У гэтых нумарах расказвалася аб тых лепшых здабытках, якіх дасягнулі за гады Савецкай улады працоўныя Брэстчыны, Віцебшчыны, Магілёўшчыны, Гродзеншчыны, Гомельшчыны і Міншчыны.

Часопіс «Беларусь» — пастаянная, заўсёды адкрытая трыбуна для нашых пісьменнікаў і паэтаў. Беларуская літаратура займае сёння віднае месца сярод братніх літаратур нашай шматнацыянальнай краіны. Яе лепшыя здабыткі далёка вядомы за межамі рэспублікі, а многія з яе творцаў сталі лаўрэатамі ўсесаюзных і рэспубліканскіх прэмій.

Многія са славутых майстроў беларускай літаратуры пачыналі свой творчы шлях на старонках «Беларусі». Першае сваё апавяданне «У завіруху» надрукаваў тут І. Мележ, адно з першых апавяданняў — І. Шамякін. Друкаваліся тут Я. Брыль, А. Кулакоўскі, П. Пестрак, Ус. Краўчанка, І. Грамовіч, М. Лобан, П. Кавалёў, М. Паслядовіч, Т. Хадкевіч, М. Лупсякоў. Першую сваю аповесць надрукавала ў «Беларусі» А. Васілевіч.

З цягам часу атрад беларускіх празаікаў-апавядальнікаў папаўняўся. На старонках «Беларусі» з'яўляліся ўсё новыя і новыя імёны. Чытач з надзеяй прывыкаў да імён І. Навуменкі, А. Асіпенкі, У. Шахаўца, Я. Васілёнка, М. Ваданосава, А. Савіцкага, І. Сіняўскага, А. Шашкова, а крыху пазней — да імёнаў І. Пташнікава, М. Стральцова, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава.

Працэс папаўнення аўтарскага актыву ідзе няспынна, і сёння чытачы часопіса знаёмяцца з творчасцю самых маладых беларускіх апавядальнікаў — А. Кудраўца, А. Жука, М. Вышынскага, І. Шальманава.

Ніколі не зніжала на старонках «Беларусі» свайго мужнага, страснага голасу і паэзія.

Наўрад ці знойдзецца хоць бы адзін вядомы ці малавядомы паэт, сталы ці малады, які б не друкаваўся ў «Беларусі». Таму, здаецца, можна было б і не пералічваць імёны паэтаў, актыўных аўтараў нашага часопіса. І ўсё ж назваць імёны тых, чые вершы з ахвотай і задавальненнем друкавала «Беларусь», хочацца: А. Астрэйка, П. Броўка, А. Бялевіч, Р. Барадулін, А. Вялюгін, С. Гаўрусёў, Н. Гілевіч, С. Грахоўскі, У. Дубоўка, С. Дзяргай, К. Кірэенка, А. Куляшоў, Е. Лось, П. Панчанка, А. Пысін, А. Русецкі, М. Танк, М. Хведаровіч... Спіс гэты, вядома, далёка не поўны.

«Беларусь» чытаюць людзі самых розных узростаў і прафесій. Таму рэдакцыя заўсёды клапоціцца аб тым, каб часопіс быў багаты на разнастайныя і цікавыя матэрыялы.

Прыемна адзначыць сёння і той факт, што тыраж часопіса, асабліва ў апошнія гады, расце.

Разам з тым мы разумеем, што на старонках часопіса ўзнімаецца яшчэ мала жыццёва важных праблем, што нарысы, апавяданні і іншыя матэрыялы, якія друкуюцца ў часопісе, не заўсёды належнай якасці і ўзроўню. Мы разумеем гэта і будзем імкнуцца да таго, каб часопіс стаў больш баявітым і актуальным.

Зусім нядаўна наша тройчы ардэнаносная рэспубліка ўрачыста адзначыла свой паўвекавы юбілей. Часопіс «Беларусь» у меру сваіх сіл занатоўваў на сваіх старонках лепшыя з яе перамог, карпатліва пісаў яе летапіс. Калектыў рэдакцыі зробіць усё, каб і надалей часопіс быў надзейным памочнікам нашай Камуністычнай партыі ў справе выхавання савецкіх людзей.

Мікола РАКІТНЫ,
рэдактар аддзела літаратуры і мастацтва часопіса «Беларусь».

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ


Кадр з фільма «Кастусь Каліноўскі».

40 ГАДОЎ НАЗАД НА ЭКРАНЫ КРАІНЫ ВЫЙШАЎ ФІЛЬМ «КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ»

Рэжысёр фільма «Кастусь Каліноўскі» Уладзімір Гардзін у свой час гаварыў:

«Кастусь Каліноўскі ў многім падобны да Івана Балотнікава, Сцяпана Разіна. Яго сіла не толькі ў вастрыні шаблі, але і ў вастрыні розуму. Ён моцны не толькі ў змаганні, але і ў спрэчцы. Ад яго зыходзіць абаянне маладосці, ён паланяе сваім бурным тэмпераментам, адвагай. Такім я хацеў паказаць Кастуся на экране...».

Такім фільм і атрымаўся.

Цяперашні глядач не ведае яго — мастацкая нямая кінастужка «Кастусь Каліноўскі» зараз не дэманструецца. А калі б фільм агучылі і пачалі паказваць у кінатэатрах з папярэднім уступным словам кіназнаўцы, моладзь, трэба спадзявацца, глядзела б яго з цікавасцю, нават з захапленнем. Па-першае, гэта ж фільм пра легендарнага Каліноўскага! Па-другое — у ім здымаліся выдатныя акцёры Мікалай Сіманаў (Кастусь), Барыс Платонаў (цыган на кірмашы), Уладзімір Уладамірскі (есаул), Барыс Ліванаў (малады граф), а таксама папулярныя ў свой час Соф'я Магарыл, Кандрат Якаўлеў, Рыгор Ге, Аляксей Феона, артысты БДТ-1 А. Церах (пракурор), Ф. Ждановіч (ксёндз). Сцэнарыстам (па матэрыялах Н. Віткоўскага і А. Гольдмана) і рэжысёрам быў У. Гардзін, які паставіў больш за 50 кінафільмаў, сярод якіх фільм пра Пушкіна «Паэт і цар». На студыі «Белдзяржкіно» ён здымаў фільмы «400 мільёнаў», прысвечаны паўстанню кітайскіх працоўных у Кантоне ў 1927 годзе, і «Песню вясны» па аповесці Якуба Коласа «На прасторах жыцця», удзельнічаў як акцёр у фільмах «Гонар свету», «Новая радзіма» (па сцэнарыі А. Вольнага), «Канцэрт Бетховена», «Чалавек у футарале» і «Салавей» (па аповесці З. Бядулі).

Загадчыкам вытворчасці «Белдзяржкіно» і дырэктарам карціны аб Каліноўскім быў у той час Міхаіл Крэсін, якога незадоўга да гэтага рэкамендаваў на работу ў беларускае кіно А. В. Луначарскі.

У Цэнтральным дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР захоўваюцца два рэдкія дакументы, адрасаваныя загадчыку «Белдзяржкіно» А. І. Галкіну.

«Гэтым сведчу, што ведаю Міхаіла Лявонцьевіча Крэсіна, як вельмі добрасумленнага работніка ў галіне кінематаграфіі, які аказаў нам сваю дапамогу з першых дзён рэвалюцыі... Асабіста я ўпэўнены, што тав. Крэсін з'яўляецца сумленнейшым і адданейшым работнікам і ў той жа час ніхто не стане адмаўляць яго вялікага кінематаграфічнага і вытворчага вопыту. Я лічу, што кожнае кінапрадпрыемства можа толькі выйграць, атрымаўшы такога выдатнага супрацоўніка.

Нарком па асвеце А. Луначарскі.

5.X.26 г.».

І яшчэ аналагічны дакумент, падпісаны Анатолем Васільевічам, з прыпіскай, якую чытаеш з асаблівым хваляваннем:

«Тав. Крэсіна ведала па рабоце ў пазашкольным аддзеле (Наркамасветы) і падтрымліваю думку А. В. Луначарскага.

Н. Крупская».

Кансультантам «Кастуся Каліноўскага» былі прызначаны дырэктар БДТ-1 (цяпер тэатр імя Я. Купалы) Я. Л. Дыла, паэт і драматург, які выступаў у друку пад псеўданімамі Назар Бываеўскі і Тодар Кулеша. Яшчэ адзін таленавіты пісьменнік прымаў непасрэдны ўдзел у нараджэнні фільма, аб чым сведчыць архіўны дакумент ад 29.VI.27 г.: «Я. Дыла і М. Чарот накіроўваюцца «Белдзяржкіно» па Менскай вакрузе для падшукання адпаведных месцаў для натурных здымкаў фільма «Кастусь Каліноўскі». Просьба да ўсіх савецкіх і вайсковых устаноў і асоб аказваць дапамогу ў іх рабоце».

Цікава і тое, як пачыналася вытворчасць кінакарціны. Першыя ўпамінанні яе адносяцца да пачатку сакавіка 1927 года. Загадчык студыі пісаў дырэктару фільма:

«...Дагаварыцеся з «Саўкіно» і Гардзіным, што гэта карціна павінна быць у што б там ні было да Кастрычніка бягучага года — да 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі — і да яе здымак трэба будзе прыступіць неадкладна...»

Да 10-годдзя Вялікага Кастрычніка ён закончаны не быў. Вышэйшы мастацкі савет, які складаўся з прадстаўнікоў Наркамасветы БССР і «Белдзяржкіно», спачатку адхіліў сцэнарны план Гардзіна. Пачаліся перароблі. Да таго ж карціна была першай сумеснай пастаноўкай беларускай студыі і Ленінградскай фабрыкі «Саўкіно». Здымачная група была ўкамплектавана няўдала. Пры вострым недахопе творчых і адміністрацыйных кадраў у калектыў траплялі выпадковыя людзі, якіх у разгар здымак то адна, то другая студыя вымушана была змяняць. «Саўкіно» скарачала каштарыс фільма і вытворчы графік. Усё гэта перашкаджала нармальнай рабоце.

Але энтузіязм стваральнікаў фільма перамагаў усё. Вялікую дапамогу аказваў калектыву Я. Л. Дыла. Гардзін успамінае пра яго:

«Прымацаваны да нашай групы спецыяліст-этнограф умешваўся літаральна ва ўсё, указваў, настойваў, патрабаваў і аказаўся вельмі карысным чалавекам у калектыве».

З усіх месц, дзе праходзілі здымкі, у Мінск паведамлялі: «Нам аказваюць усямернае садзеянне...».

Цяжка было з арганізацыяй масавых сцэн. На выручку прыйшло камандаванне Беларускай ваеннай акругі. Захаваўся ў архіве ліст намесніка загадчыка «Белдзяржкіно» да тагачаснага камандуючага акругі Ягорава: «Падаўца гэтага ліста камандзіруецца да Вас для найлепшага разрашэння пытання аб прадастаўленні Вамі для здымак патрэбных воінскіх адзінак. Упэўнены, што Вы, безумоўна, прыйдзеце нам на дапамогу ў такой важнай палітычнай рабоце па фільме «Кастусь Каліноўскі»...

Нарэшце ў снежні 1928 — студзені 1929 года ў цэнтральных газетах з'явілася на самых відных месцах рэклама:

«Сёння і штодзённа Грандыёзны гістарычны фільм «Кастусь Каліноўскі»!!! Драма ў сямі частках...»

Фільм меў вялікі поспех у гледачоў. Але рэцэнзенты аднесліся да яго вельмі сурова, абвінавацiўшы рэжысёра ў тым, што «складаны класавы пераплёт даецца ў надзвычайна прымітыўным паказе» («Известия», 13.XII.1928 года). Аб станоўчым у карціне гаварылася так:

«Галоўную ролю Каліноўскага грае вельмі добра малады артыст Сіманаў... Вобраз Кастуся ў паказе Сіманава вельмі прываблівы і запамінальны».

Карціна выклікала бурныя спрэчкі і ў Асацыяцыі рэвалюцыйных кінематаграфістаў, дзе Гардзіна абвінавацілі нават... у беларускім нацыяналізме, а таксама ў супрацьпастаўленні героя масам.

Вядома, у фільме ёсць недахопы. І лепш за ўсё іх бачыў сам Гардзін. «У «Кастусе Каліноўскім» мне не ўдалося з належнай выразнасцю паказаць сілу сялянскага паўстання, — пісаў ён. — Разам з гераічнай фігурай Каліноўскага я не здолеў паставіць вобразы яго паплечнікаў — паўстаўшых «панскіх халопаў». Любоўны сюжэт, раскошныя сцэны ў палацах і замках занялі ў фільме празмерна вялікае месца...»

Але, не зважаючы на ўсё гэта, гледачы радаваліся сустрэчы з Каліноўскім — Сіманавым, напружана сачылі за дзеяннем, захапляліся героікай народнай барацьбы.

Прэм'ера фільма адбылася ў Мінску ў жніўні 1928 года, у Маскве — у снежні. Масавы ж глядач змог убачыць карціну толькі ў 1929 годзе. І вось з якім энтузіязмам яна была ўспрынята. У мінскай газеце «Рабочы» з'явіўся набраны буйным шрыфтам «баланс» дэманстрацыі фільма:

«Наведала за 6 дзён — 24 800 чалавек.
Пайшло, не атрымаўшы білетаў, — да 10 000 чалавек.
Не бачыла яшчэ карціну ¾ насельніцтва горада.
Каб даць магчымасць усім бачыць, пастаноўка грандыёзнага мастацкага баевіка працягваецца ў кіно «Пралетарый».
Усе 100% насельніцтва Мінска на «Кастуся Каліноўскага»!

Праз тыдзень газета паведамляла:

«Мінск не памятае такога поспеху!
2 тыдні біткавых збораў.
40 перапоўненых сеансаў.
За 2 тыдні дэманстрацыі нашумеўшага фільма «Кастусь Каліноўскі» яго наведала 32 600 чалавек.
Рэкорд наведвання карціны.
3 прычыны такога каласальнага поспеху фільм пралангіраваны на тыдзень».

Прайшло сорак гадоў. На семінарскіх занятках у Саюзе кінематаграфістаў БССР, на праглядах у Доме мастацтва кінематаграфісты і акцёры беларускіх тэатраў вывучаюць гэты першы кінатвор пра Каліноўскага сур'ёзна і ўважліва.

Мы звярнуліся да некаторых стваральнікаў кінакарціны з просьбай падзяліцца ўспамінамі. Вось што піша народны артыст СССР Мікалай Сіманаў: «З фільмам «Кастусь Каліноўскі» ў мяне звязана першая сустрэча з сапраўдным рэвалюцыйным героем у кіно... Рэжысёр У. Р. Гардзін — у мінулым буйны артыст тэатра, у будучым цудоўны кінаакцёр — умеў у сваіх пастаноўках збіраць бліскучы акцёрскі калектыў. К. Якаўлеў, Б. Ліванаў, А. Феона стварылі вобразы такіх бязлітасных ворагаў народа, што мне ў ролі Кастуся прыходзілася кідаць у схватку з імі ўвесь свой творчы тэмперамент.

Лепшымі сваімі сцэнамі ў фільме лічу, па-першае, дуэль з Ліванавым — Старжынскім. Мы шмат рэпеціравалі, здавалася, устанавілі дакладныя мізансцэны, але, захопленыя барацьбой на здымках, біліся як «маладыя ільвы», дапускаючы нечаканыя імправізацыі. Майстэрства аператара Аптэкмана пераадолела ўсе цяжкасці. На экране дуэль атрымалася яркай і буйнай схваткай двух ворагаў з розных светаў... Тых светаў, барацьба якіх да гэтай пары з'яўляецца галоўнай тэмай сапраўднага Мастацтва.

А другая сцэна, якая мне памятаецца, — пакаранне смерцю Каліноўскага. Нянавісць да насілля, да жандараў, якія акружылі эшафот, прага барацьбы з імі, адчуванне сваёй непарушнай сувязі з народам, які запоўніў плошчу — усё гэта я павінен быў паказаць. І яшчэ пяшчотную жаласць, каханне, жаданне перадаць хоць частку сваёй сілы Марылі, мілай маёй нявесце, якая, ледзь стрымліваючы слёзы, глядзіць на свайго Кастуся. Хачу пажадаць беларускім кінематаграфістам з гонарам працягваць свой слаўны шлях, пачаты 40 гадоў назад хвалюючым рэвалюцыйным фільмам «Кастусь Каліноўскі».

Ліст да Тацццяны Дзмітрыеўны Булах-Гардзінай застаў яе хворай, але яна знайшла ў сабе сілы напісаць у адказ радкі, поўныя хвалявання:

«Мне было 18 гадоў, калі я здымалася ў «Кастусе Каліноўскім»... З кінафабрыкай «Белдзяржкіно» звязана не толькі работай, але і людзьмі, з якімі я сябравала. Я з задавальненнем прыеду да вас у Мінск, раскажу ўсё, што ведаю аб першых гадах вашай студыі, аб тым, як упершыню здымаўся ў ролі цыгана ваш цудоўны артыст Барыс Платонаў... Рэжысёр Гардзін рашыў, што я буду здымацца ў ролі Марылі, нявесты Кастуся. А я так баялася Сіманава, буйнага, гарэзлівага акцёра! Гэты бясконца абаяльны чалавек, пасмейваючыся з мяне, вучыў галоўнаму акцёрскаму абавязку перад гледачом — шчодрай аддачы ўсіх сваіх магчымасцей...

Усё было ў мяне ў тую пару здымак «Кастуся» ўпершыню. Першая роля ў кіно, першае шчасце творчасці сярод сапраўдных артыстычных талентаў і першая любоў да чалавека, з якім я пражыла ўсё сваё жыццё. З Гардзіным я пісала сцэнарыі, кнігі, артыкулы, здымалася, выступала на сцэне, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны, застаючыся ўсе 900 дзён блакады ў радах абаронцаў Ленінграда, ездзіла па воінскіх часцях, рыхтавала выступленні артыстаў самадзейнасці.

Калі пасля вайны я ў адной з вёсачак Закарпацця ўбачыла наш з Сіманавым партрэт, калі пачула расказ аб тым, што нашы кінагероі былі сябрамі і духоўнай падтрымкай для сялян Закарпацця, Беларусі, Літвы, — я зразумела, што недарма прайшло жыццё майго сябра Уладзіміра Гардзіна, а з ім і маё сціплае жыццё. А пачыналася ўсё з «Кастуся Каліноўскага»! Вось чаму так дарагі мне гэты фільм...»

Гаворыць народны артыст СССР Уладзімір Іосіфавіч Уладамірскі:

— У рэпертуары нашага БДТ-1 быў спектакль «Кастусь Каліноўскі» па п'есе Е. Міровіча. Я іграў ардынарца Маставога. Аднойчы пасля прадстаўлення да мяне ў грымёрную зайшоў чалавек гадоў пад трыццаць — сорак, сказаў, што бачыў мяне зараз на сцэне, што ён будзе здымаць фільм пра Каліноўскага, але не па гэтай п'есе, а па спецыяльна напісаным сцэнарыі і прапанаваў мне ролю казацкага сотніка Цімафеева. Я папярэдзіў, што ніколі не здымаўся... Прывезлі мяне пад Мінск у вёску Новы Двор, апранулі ў казацкую афіцэрскую форму і далі ўзвод пераапранутых кавалерыстаў з сёмай Самарскай дывізіі. А я ў ёй у той час кіраваў мастацкай самадзейнасцю. Так што хлопцы былі блізкія і знаёмыя. Калі падалі каня, каб садзіцца, Гардзін гаворыць: «Э, дык гэта сапраўдны казак!» Так, адказваю, я былы кавалерыст. «Дык нам, — гаворыць ён, — такога і трэба. А што датычыцца Сіманава, не ўмее ён верхам ездзіць, — навучыце вы яго». Звярнулі тады ўвагу і на Платонава. Быў ён рухавы, прыгожы, кучаравы. Вось яго і запрасілі на ролю цыгана, які на кірмашы каня прадае. Ён так задорна сыграў гэтую ролю...

Шкада, што гісторыкі і кіназнаўцы не паспелі распытаць аб удзеле ў фільме народнага артыста СССР Барыса Віктаравіча Платонава, славу і гонар беларускага мастацтва — яго дэбют у кіно быў такім яркім!

Мы прывялі ўспаміны ўдзельнікаў фільма. Што ж датычыцца гледачоў, дык наўрад ці мы перабольшым, сказаўшы, што для многіх аматараў кіно рамантычная, сапраўды прыгодніцкая стужка, героем якой стаў легендарны беларускі герой-рэвалюцыянер Каліноўскі, стала самым яркім творам «сінематографа» сорак гадоў назад (ды і пазней — фільм дэманстраваўся на экранах вельмі доўга, заваёўваючы новую і новую аўдыторыю). Гэта быў першы кінатвор, які праславіў маладую нацыянальную студыю, яе цікавы творчы калектыў, здольны па-мастацку распрацоўваць самыя складаныя тэмы. У гісторыі савецкай гісторыка-рэвалюцыйнай кінематаграфіі «Кастусь Каліноўскі» — яркая старонка.

І. РЭЗНІК.

ПОМНІКІ НАШАГА КРАЮ

ФАРНЫ КАСЦЁЛ У ГРОДНА

Кожны, хто бывае ў Гродна, не можа не залюбавацца на галоўнай плошчы фарным касцёлам. Гэта выдатны помнік архітэктуры Беларусі XVI — XVIII стагоддзяў. Вялікім аб'ёмам і своеасаблівым сілуэтам ён маляўніча ўпісваецца ў ансамбль гістарычнай часткі горада.

Фарны (былы езуіцкі касцёл — самы буйны культавы будынак Гродна. Калісь касцёл і манастыр пры ім былі самымі багатымі ў Рэчы Паспалітай і займалі цэлы квартал горада. У комплекс пабудоў уваходзілі, акрамя касцёла і манастырскіх келляў, езуіцкая школа, аптэка, трапезная і мноства дапаможных памяшканняў. Манастырскія пабудовы з гаспадарчымі дварыкамі схаваны за высокай каменнай сцяной.

Будаўніцтва касцёла было пачата ў 80-я гады XVI стагоддзя. У 1732 годзе ў вонкавым выглядзе касцёла і яго інтэр'еры адбыліся некаторыя змены. З таго часу ён не перабудоўваўся.

Аб першапачатковым знешнім выглядзе будынка можна меркаваць па карціне XVII стагоддзя, якая захоўваецца ў самім касцёле. Раней галоўны фасад быў больш сціпла ўпрыгожаны архітэктурнымі дэталямі, а дзве яго вежы не былі так мудрагеліста аздоблены скульптурай, уласцівай развітаму барока. У першай палавіне XIX ст., пасля выгнання езуітаў з Расіі, у будынку размясціўся Фарны касцёл.

Для яго прасторавай кампазіцыі характэрна тое, што тут сумешчаны тыпы двухвежавага і купальнага храмаў. Такі прыём не часта сустракаецца ў архітэктурных помніках Беларусі.

У плане касцёл расчленены на тры часткі (нефы). У аснове яго ляжыць крыж, над якім узвышаецца купал. Праз аркі ён абапіраецца на магутныя слупы. Асабліва вялікае значэнне купал мае ў кампаноўцы ўнутранай прасторы.

Галоўны фасад касцёла — трохярусная кампазіцыя з дзвюма вежамі-званіцамі. Фасад падкрэслена падзелены ў вертыкальным і гарызантальным напрамках. У вертыкальным — здвоенымі пілястрамі, у гарызантальным — міжярусных карнізнымі паясамі. Кідаецца ў вочы і тое, што фасад насычаны ордэрам, шмат тут складаных прафіліровак, арачных і прамавугольных ніш і праёмаў, слаістых пілястраў, а вежы выкананы ажурна і сілуэтна. Усё гэта характэрна для барока.

У ніжняй частцы будынка выкарыстаны некананічныя капітэлі і базы. Да галоўнага ўваходу вядзе развітая барочная лесвіца, упрыгожаная скульптурай.

Урачысты і пышны інтэр'ер храма. У яго ўпрыгожанні шырока выкарыстаны сродкі архітэктурнай пластыкі, скульптура і жывапіс. Асаблівую прывабнасць інтэр'еру надаюць развітая многафігурная кампазіцыя ў алтары і апорныя слупы, упрыгожаныя дэкарацыйнымі калонкамі іканастасаў. Выкананыя цалкам з дрэва, гэтыя дэкаратыўныя элементы маюць высокую мастацкую каштоўнасць.

Калі параўноўваеш цудоўную лепку і разьбу, на якія багаты Фарны касцёл у Гродна, з работамі разьбяроў у інтэр'ерах праваслаўных беларускіх храмаў, то знаходзіш многа агульнага ў іх мастацкай манеры і тэхнічным выкананні. Несумненна, сярод майстроў, якія афармлялі касцёл, былі мясцовыя беларускія разьбяры-дэкаратары. Многа працы прыклалі яны, прымусіўшы жыць і гаварыць мовай мастацтва камень і дрэва.



Ул. ЧАНТУРЫЯ.

ЗАРУБЕЖНАЕ АПАВЯДАННЕ

П'ер БЕРТАН

(Канада)

ВЯСЕЛЛЕ НАВЫВАРАТ

ГУМАРЭСКА

Апошнім часам шмат хто з маіх сяброў развёўся з жонкамі. А зусім жа нядаўна яны жаніліся, і я выступаў у ролі шафера, тамады, свата... А цяпер кола закруцілася ў адваротным напрамку, мае сябры часцей становяцца халасцякамі, чым жанатымі.

І вось у мяне склалася ўражанне, што з разводамі ў нас нейкі непарадак. Часта я нават не ведаю, хто з кім разводзіцца, а калі да мяне і даходзяць чуткі, што нехта з некім наважыўся скасаваць шлюб, дык я не ведаю, у які дзень адбудзецца гэтая падзея. Былыя сябры часта перастаюць вітацца са мною, бо, бачыце, я паспеў сямутаму сказаць, што яны развяліся, а на самой справе, аказваецца, яны паспелі перадумаць.

Карацей кажучы, у нас няма пакуль што адпаведнага абраду, належнай цырымоніі з выпадку таго, што людзі разводзяцца, як гэта прадугледжана, напрыклад, для тых, хто рашыўся на матрыманіяльны крок. А чаму? Хіба нельга ўключыць у кнігу абрадаў і малітваў і шлюбаразводную цырымонію? Думаецца, што ідэя гэта варта ўвагі, асабліва з пункту гледжання гандляроў кветкамі, уласнікаў універсальных магазінаў, паштовага ведамства, тэлеграфных агенцтваў, рэдактараў аддзелаў свецкага жыцця вячэрніх газет, пастаўшчыкоў правізіі і пракатчыкаў смокінгаў фірмы Сіда Сілвера. Дык вось мая прапанова: трэба зрабіць шлюбаразвянчальны абрад такім жа неабходным актам, як і вянчанне! Трэба рассылаць каліграфічныя друкаваныя запрашэнні ў двух асобных канвертах! Трэба запрашаць на ўрачыстасць сваіх сяброў і ворагаў!

Абрад па скасаванні шлюбу, на маю думку, трэба праводзіць у царкве. Галоўную ролю павінен выконваць той самы свяшчэннік, які некалі звязаў былых жаніха і нявесту вузамі шлюбу. Павінны быць і шаферы, толькі, вядома, з белымі гваздзікамі ў пятліцах. Павінны быць і шаферкі. Яны павядуць сяброў мужа і жонкі па бакавых праходах і рассадзяць іх па абодва бакі аналоя.

Галоўным распарадчыкам на цырымоніі будзе спецыяльна створанае агенцтва Роберта Сімпсана. Вядома, я прадбачу і пэўныя цяжкасці. Напрыклад, муж не захоча апранаць святочны гарнітур, а жонка заблытаецца ў зашмарках развянчальнай сукенкі, ёй можа стаць млосна і яна можа крыху сапсаваць былому мужу свята. Але, думаецца, усё абыдзецца.

Задача мужа — сарваць з пальца сваёй экс-жонкі вянчальны пярсцёнак, шпурнуць яго на падлогу і растаптаць. Экс-жонка горда пакідае царкву, абапіраючыся на руку зноў пяшчотна любімага бацькі, які некалі выдаў яе замуж і цяпер без энтузіязму бярэ назад.

Сама цырымонія павінна быць сціплай і поўнай годнасці. Некалькі ціхіх адказаў «Так» на пытанні свяшчэнніка адносна таго, ці адвяргае ён альбо яна яе альбо яго як сваю законную палавіну, якую ён альбо яна не хоча больш песціць, любіць і клапатліва аберагаць. Потым свяшчэннік звяртаецца да прысутных з рытарычным пытаннем: «Калі хто са сведак ведае якую-небудзь прычыну, па якой гэтая пакуль што жанатая пара не можа быць разлучана, хай скажа». Думаю, што на пытанне гэтае ніхто не абзавецца, і цырымонія хутка і шчаслівa скончыцца.

Пасля гэтага новаразведзеная пара накіроўваецца ў рызніцу і выкрэслівае з рэгістрацыйнай кнігі шлюбаў свае імёны. Тым часам мясцовы тэнар спявае адпаведную песню, напрыклад: «Разлука ты, разлука». Паяўляецца фатограф — здымкі патрэбны не толькі для свецкай хронікі, але і для «Альбома разводаў», які павінен быць абавязковым атрыбутам урачыстасці. Праўда, фатографаў павінна быць двое, бо стане традыцыяй, што развянчаная пара будзе выходзіць праз асобныя дзверы. Госці кідаюць канфеці і, на злосць новаспечанай нявесце, старыя чаравікі экс-мужа, якія ён раней раскідваў па хаце.

Потым наладжваецца ўрачысты прыём — антывясельны банкет. На ім усё ідзе так, як і належыць у такіх выпадках — віншаванні сяброў, хмельны пунш, тост маці за новаразведзеных, у якім яна выказвае сваю радасць ад таго, што яе дачушка, нарэшце, уратавалася ад страшыдлы. Колішні жаніх адказвае тостамі ў гонар былых цесця і цешчы. Уголас чытаюцца тэлеграмы, галоўным чынам віншаванні ў адрас новаяўленага жаніха ад даўніх знаёмых яго маладзіц, якія запрашаюць яго да сябе на абед у суботу вечарам.

І вось ужо разразаюць пірог з надпісам: «Шчаслівага разводу!» Фатографы шчоўкаюць затворамі сваіх камер.

Пасля таго, як пірог разрэзаны, свабодная ад шлюбных абавязкаў жанчына шпурляе свой букет жоўтых ружаў, і некаторыя зайздрослівыя дамачкі кідаюцца да яго, бо ёсць прыкмета, што тая, хто першай схопіць кветкі, будзе наступнай у чарзе на развод.

Ці гаварыў я пра вясельныя падарункі? Усе яны павінны быць раскладзены ў суседнім пакоі для ўсеагульнага агляду — на кожным з іх значыцца імя таго, хто яго некалі прынёс. Інакш нельга — людзі павінны ведаць, што каму забіраць. Але баюся, што вазы, кубкі, талеркі будуць крыху шчарбатыя — вынік тых шчырых сямейных размоў, што прывялі да разводу.

Вось амаль і ўсё, што я магу прапанаваць для шлюбаразводнай цырымоніі. З цягам часу, па меры таго, як мая ідэя глыбока пусціць карэнні, кожная мясцовасць, безумоўна, узбагаціць яе ўласнымі вытанчанымі ўдасканаленнямі.

Пераклад з англійскай мовы С. ДОРСКАГА.


МАРОЗ І СОНЦА. Фотаэцюд Л. ШАСТАКОВА.

КУТОК КАЛЕКЦЫЯНЕРА

ПОМНІКІ АРХІТЭКТУРЫ

Міністэрства сувязі СССР выпусціла серыю з шасці паштовых марак, прысвечаных помнікам архітэктуры ў СССР. На трохкапеечнай мініяцюры — адлюстраванне драўлянага жылога дома ў Заанежжы (1876 год). Колеры — карычневы і жоўты.

На марцы вартасцю ў чатыры капейкі — упрыгожаныя разьбой веснічкі 1848 года (Горкаўская вобласць). Колеры: цёмна-зялёны і зеленавата-жоўты.

Адлюстраванне сусветна вядомага помніка рускага народнага драўлянага дойлідства пачатку XVIII стагоддзя храма Кіжы змешчана на 6-капеечнай марцы. Ансамбль Кіжы размешчаны на ўзбярэжжы Анежскага возера ў Карэльскай АССР. Колер маркі — фіялетавы.

На малюнку маркі вартасці ў 10 капеек помнік рускай архітэктуры — Крэмль у Растове-Яраслаўскім (XVI — XVII стагоддзі). Колер: шэра-сіні і шэры.

На 12-капеечнай марцы паказаны вароты ў падмаскоўнай царскай сядзібе Царыцына, пабудаваныя па праекце архітэктара Васіля Бажэнава (1785 год). Колер маркі — светла-малінавы.

Вуліца дойліда Росі ў Ленінградзе паказана на марцы наміналам у 16 капеек. Колеры: цёмна-карычневы і жоўты.

Арыгіналы марак падрыхтаваны мастаком Андрэем Катыровым. Друкаванне — металаграфія, папера мелаваная. Зубцоўка грабеньчатая. Памер па перфарацыі 28 на 40 міліметраў. Нумары па каталозе 3754 — 3759 уключна.

А. МАРКУС.
(АДН).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

24 студзеня

Першая праграма. 9-10 — тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 8-ы клас. «Дакастрычніцкі перыяд жыцця і творчасці Янкі Купалы». 9-45 — «Юныя маракі». Кінанарыс. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — для дзяцей. «Цуды прыроды» (М). 10-3 — Л. Ляонаў. «Барсукі». Тэлевізійны спектакль. Частка 3-я (М). 12-10 — праграма Новасібірскай студыі тэлебачання (М). 17-15 — «Навіны». 17-25 — праграма перадач. 17-30 — для школьнікаў. «Падарожжа ў кнігу» (М). 18-00 — для школьнікаў. Канцэртная зала «Арфей». «Малюнкі з выстаўкі». 18-45 — «Навіны». 19-00 — «Клуб кінападарожнікаў» (М). 20-00 — «Эстафета навін» (М). 20-45 — навуковую арганізацыю працы — у сельскую гаспадарку. Перадача 8-я. «Калектыў і кіраўнік». 21-00 — «Грацыі сустракаюцца ў Рызе». Рэпартаж аб спаборніцтвах па мастацкай гімнастыцы. БССР — Латвія... 21-15 — «Анна Карэніна». Фільм-спектакль. Першая і другая часткі.

Другая праграма. 18-00 — канцэрт духавога аркестра Ваенна-Марскога Флоту СССР (М). 19-00 — «Сакратар райкома». Мастацкі фільм. 20-25 — для веруючых і няверуючых «Дамарослыя святыя». Кінанарыс. 20-45 — «Экран збірае сяброў» (М). 21-45 — праграма Новасібірскай студыі тэлебачання (М). 22-45 — «Клічуць дарогі далёкія». Турысцкі альманах (М). 23-15 — «Толькі факты». Праграма перадач.

25 студзеня

Першая праграма. 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Дэталі машын». 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00 — музычная вясёлая праграма (М). 10-30 — «Па абодвух баках граніцы». Тэленарыс (М). 11-00 — «Аб'ектыў». Тэлевізійны клуб кінааматараў (М). 12-00 — «Матч дружбы». Сустрэча па плаванні Мінск — Вільнюс — Рыга — Талін. 13-50 — «Музычная шкатулка». 14-00 — «Эўрыка». Тэлевізійны часопіс. 14-40 — «У свеце вобразаў, слова і фарбаў». Тэлевізійны часопіс. 15-40 — першынство СССР па хакеі СКА (Ленінград) — «Тарпеда» (Мінск). II і III перыяды. 17-20 — «Па законах сваёй мары». Музычны фільм. 18-00 — «На агеньчык». Перадача з Кіева. 19-00 — «КВЗ-69» (М). 20-25 — тэлевізійныя навіны (М). 21-00 — «Ён пайшоў адзін». Мастацкі фільм. Першая серыя. 22-25 — «Аўтамабіль, пешаход, вуліца». 22-45 — першынство Еўропы па скарасным бегу на каньках. Мужчыны. Перадача з ФРГ (у запісе) (М).

Другая праграма. 12-00 — «Прагрэс». Інтэрвізійны часопіс (М). 12-30 — «Здароўе». Перадача з Сочы. 13-00 — тэлевізійны тэатр для дзяцей. «Забіць перасмешніка». Спектакль Маскоўскага тэатра юнага гледача (М). 15-00 — у эфіры — «Маладосць». «Факел». Перадача з Горкага. 16-00 — тэлевізійныя навіны (М). 16-15 — «Мой завод — мая сям'я». Перадача з Ленінграда. 16-45 — праграма каляровага тэлебачання (М). 19-00 — Джон Б. Прыстлі. «Доктар Солт ад'язджае». Тэлевізійны спектакль. Першая і другая серыі. 20-50 — рэклама, аб'явы. 21-00 — «Свет сацыялізма» (М). 21-30 — «Марыяна». Мастацкі фільм (М).

26 студзеня

Першая праграма. 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Тэхналогія металаў». 9-00 — «На зарадку, станавіся!» (М). 9-15 — тэлевізійныя навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — «Музычны кіёск» (М). 10-30 — «Скарбы Ленінграда». Перадача з Ленінграда. 10-45 — для юнацтва. «Навука перамагаць». Алімпіяда па гісторыі ваеннага майстэрства і сучаснай тэхніці ўзбраення. Першы тур (М). 11-45 — старонкі любімых кніг на экране. «Лёс барабаншчыка». Мастацкі фільм (М). 13-15 — насустрач выбарам у мясцовыя Саветы БССР. «Тэлевізійны агітпункт». 13-25 — «Хроніка музычнага жыцця рэспублікі». Год 1937-ы. 14-00 — «Сельская гадзіна» (М). 15-00 — для школьнікаў. «Вас выклікае спартландыя». 16-00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Пад баявымі сцягамі». 16-30 — «Ён пайшоў адзін». Мастацкі фільм. Другая серыя. 17-50 — «У свеце холаду». Кінанарыс. 18-00 — спартыўная перадача (М). У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 21-00 — «Еўропа: падзеі, краіны, праблемы» (М). 21-45 — С. Гансоўскі. «Голас». Тэлевізійны спектакль (М). 22-30. — спартыўны тыдзень (М). 22-45 — першынство Еўропы па скарасным бегу на каньках. Мужчыны. Перадача з ФРГ (у запісе) (М).

Калектыў Беларускай дзяржаўнай філармоніі выказвае спачуванне супрацоўніку філармоніі Налецьку У. В. у сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю дачкі.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыемнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры, вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 03552